КУЛЬТУРА

"За духоўнае адраджэнне"

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 37 (1424)
14 верасня 2019 г.

Ты святкуй, мая сталіца!



Фота Наталлі ОВАД

Працяг тэмы — **на старонках 2 — 3, 13.**

Соцыум

"ТАК СУМНА-СУМНА Ў ЦІШЫНЕ..."

Багдановічавы радкі нібы люстраным адбіткам кладуцца на сітуацыю з гістарычнымі паркамі Беларусі. Як яе выправіць?

ст. 4 — 5

Персона

ВЕЧНА МАЛАДЫ БЕЛАРУСКІ ФАЎСТ

Знакамітаму графіку сучаснасці Арлену Кашкурэвічу заўтра спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння. Чым уражвае спадчына бліскучага мастака?

ст.7

Погляд з XXI стагоддзя

НЕ СУМАВАЦЬ ПА СТРАЧАНЫМ, НЕЗВАРОТНЫМ...

17 верасня — тая светлая дата ў гісторыі краіны, якая ўвекавечана ў назвах вуліц многіх нашых гарадоў ды паселішчаў. Ёсць яна і ў Гродна. Беларусь у 1939-м назаўсёды стала маналітна-адзінай.

ст. 14 — 15

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Дыялог Сінявокай і Паднябеснай

Намеснік міністра культуры і турызму КНР Чжан Сюй (злева) і міністр культуры краіны Юрый Бондар у бібліятэцы БДУКіМ.

13 верасня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбылося трэцяе сумеснае пасяджэнне Камісіі па культурным супрацоўніцтве Беларуска-Кітайскага Міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве. Мерапрыемства праходзіла з удзелам міністра культуры Беларусі Юрыя Бондара.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ / Фота аўтара

Падчас сустрэчы былі абмеркаваны самыя розныя пытанні, у тым ліку супрацоўніцтва паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры і турызму КНР у рамках Камісіі, стан і перспектывы дзейсных кантактаў у музейнай сферы, у сферы кіно і тэлерадыёвяшчання, у галіне бібліятэчнай справы, выдавецкай дзейнасці ды многія іншыя.

Напрыканцы мерапрыемства адбылося падпісанне Пратакола трэцяга сумеснага пасяджэння Камісіі па культурным супрацоўніцтве Беларуска-Кітайскага Міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве.

Больш падрабязна пра тое, што абмяркоўвалася Камісіяй, пра далейшую рэалізацыю творчых планаў абедзьвюх краін, "К" раскажа ў бліжэйшых нумарах газеты.

К

Сустрэць традыцыі ў сучаснасці

12 і 13 верасня ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі прайшла X штогадовая навукова-практычная канферэнцыя "Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў".

Мэтай канферэнцыі было абмеркаванне ролі навуковых даследаванняў у галіне архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, тэатразнаўства, музыкі, фатаграфіі, кіно, экранных відаў мастацтваў у вырашэнні актуальных задач сучаснай культуры, а таксама пошук сістэмных падыходаў у справе захавання нацыянальных культур і гісторыка-культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі.

У канферэнцыі ўзялі ўдзел вядучыя спецыялісты з Беларусі і краін СНД — Расіі, Украіны, Казахстана, Узбекістана, Арменіі, Малдовы, а таксама з Вялікабрытаніі.

Падчас канферэнцыі сталічная крама "Акадэмкніга" прадэманстравала ўдзельнікам форуму навуковыя выданні, якія можна было набыць на кніжнай выставе-продажы. Таксама ў якасці суправаджальных мерапрыемстваў канферэнцыі адбыліся кінапаказы дакументальных фільмаў з цыкла "Беларускі народны каляндар", круглы стол "Беларускае канцэртнае выканальніцтва ў кантэксце сусветнай культуры", наведванне залы экспазіцыі чарнобыльскай зоны Музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі.

К

Газета КУЛЬТУРА ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Адказны сакратар — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Настасся ПАНКРАТАВА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэклямны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2019.
Наклад 3367. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 13.09.2019 у 16.00. Замова 3018.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Ты святкуй, мая сталіца!

Напярэдадні святкавання Дня горада пра запланаваныя мерапрыемствы ў сталіцы распавёў намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Аляксандр ШАСТАКОЎ:

— Свята адзначаецца на выходныя 14 — 15 верасня, але ж святочныя мерапрыемствы праходзяць і напярэдадні. Я спынюся на найбольш яркіх праектах, бо ў праграме вельмі шмат рознапланавых падзей, — паведаміў Аляксандр Шастакоў. — Напрыклад, ужо 13 верасня ў Палацы культуры падводзяцца вынікі гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства "Мінскі майстар". У конкурсе прынялі ўдзел больш за 16 тысяч чалавек па 39 прафесіях, а ў фінал выйшлі толькі 620 канкурсантаў. Узнагароды "Найлепшы па прафесіі" атрымаюць 39 пераможцаў. Маштабы зразумелыя, таму гэты конкурс сапраўды дае магчымасць выбраць майстроў сваёй справы.

Асноўныя мерапрыемствы афіцыйнага святкавання Дня горада пачнуцца ў Мінску з ускладання кветак да абеліска "Мінск — горад-герой" 14 верасня аб 11-й гадзіне. У гэты ж дзень у зялёнай зоне ўздоўж праспектаў Пераможцаў і Машэрава адбудзецца Міжнародны фестываль гісторыі і культуры "Мінск старажытны" — інтэрактыўнае відовішча ад клубаў гістарычнай рэканструкцыі, якія прадставяць Беларусь і ў якім прымуць удзел таксама госці з Украіны, Расіі, Кітая, Галандыі, Італіі, ЗША.

На пляцоўцы каля Палаца спорту 14 верасня працягнуцца міжнародныя спаборніцтвы "Наймацнейшы пажарны-ратавальнік", у якіх прымаюць удзел прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога ўпраўленняў МНС, а таксама розныя аварыйна-выратавальныя службы і ведамствы з дзевяці краін блізкага і далёкага замежжа: Літвы, Латвіі, Эстоніі, Чэхіі, Бельгіі ды іншых.

Акрамя таго, у рамках святкавання Дня горада на выходных нас чакае закрыццё мотасезона H.O.G. Rally Minsk 2019, дзе на пляцоўцы каля Палаца спорту ў першы дзень з 14 да 21 гадзіны, а ў другі — з 11 да 23 гадзін адбудзецца спаборніцтва мотакаскадзёраў з розных краін. На пляцоўцы будуць арганізаваны таксама музычныя выступы, фудкорт, запрацуе дзіцячы гарадок і аніматары.

— Я ведаю, што СМІ любяць запытваць, а што будзе новенькага? — працягваў Аляксандр Шастакоў. — На гэтае пытанне я адказаў бы, што на тэрыторыі Верхняга горада пройдзе праект "Мінск інтэрнацыянальны". Каб паказаць, што Мінск — горад магчымасцяў, які гатовы да супрацоўніцтва, і пазнаёміцца з культурамі розных краін, мы праводзім у рамках летняга музычна-турыстычнага сезона святы нацыянальных культур і гэтае свята. Акрамя таго, у рамках Дня горада Мінска госці і мінчукі запрашаюцца на ўсім вядомы музыкальны праект "Пешахока", а таксама тэатральны "Без сцэны". Увечары каля мінскай гарадской ратушы запланаваны канцэрт артыстаў балета Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Урачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод "Мінчанін года" з удзелам Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь і майстроў мастацтваў Беларусі сёлета адбудзецца на Кастрычніцкай плошчы 14 верасня а 20-й гадзіне.

14 верасня ахвотных запрашае мінскі паўмарафон, які пачнецца а 9-й раніцы, — працягвае Аляксандр Шастакоў, а таксама "Дзень танкіста", які штогод можна наведаць на тэрыторыі Парка Перамогі. У Мінскім гарадскім палацы культуры па вуліцы Маякоўскага пройдзе гарадскі фестываль творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі "Мастацтва жыць — тварыць мастацтва".

Акрамя асноўных масавых мерапрыемстваў у цэнтральнай частцы горада па-свойму святкаваць будуць у кожным раёне Мінска. Аляксандр Шастакоў падкрэсліў:

— Сёння кожны з нас можа прызнацца ў любові да сваёй сталіцы, і гэтыя яркія мерапрыемствы дапамагаюць яе кожнаму выказаць.

Валянціна КРАСОЎСКАЯ, студэнтка факультэта журналістыкі БДУ

Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА.

*

Стыпендыяльная праграма Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча Gaude Polonia

Нацыянальны цэнтр культуры ў Варшаве аб'яўляе набор на XIX конкурс (на 2020 год) стыпендыяльнай праграмы Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча Gaude Polonia.

Праграма Gaude Polonia прызначана для маладых творцаў і перакладчыкаў з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, у першую чаргу з Беларусі і Украіны.

Стыпендыяльнае знаходжанне ў Польшчы пачнецца 1 лютага і будзе доўжыцца да 31 ліпеня 2020 года.
Набор удзельнікаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове.
Кандыдаты павінны валодаць польскай мовай на базавым узроўні.

Заяўкі прымаюцца да 15 кастрычніка 2019 года.

Неабходныя дакументы:
— заяўка на атрыманне стыпендыі;
— мінімум 2 рэкамендацыі ад вядомых у абранай галіне дзейнасці творцаў;
— партфоліа ў папяровым ці электронным выглядзе CD / DVD.

Заяву на ўдзел можна падаць праз Польскі Інстытут у Мінску (Мінск, вул. Валадарскага, 6) або непасрэдна ў Нацыянальны цэнтр культуры ў Варшаве (01-231 Варшава, вул. Плоцка, 13).
Падрабязная інфармацыя аб Праграме, умовах удзелу і бланкі анкет на старонцы: https://www.nck.pl/dotacje-i-stypendia/stypendia/programy/gaude-polonia/dokumenty.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у Нацыянальным цэнтры культуры ў Варшаве (тэл. +4822 3509530, e-mail: bberdychowska@nck.pl), а таксама ў Польскім Інстытуце ў Мінску (тэл. +37517 2006378, 2009581).

Narodowe Centrum Kultury
Польскі Інстытут Мінск

Фота Паўла БАСА

Эстафета оперных гісторый

Традыцыйная кітайская опера ва ўсёй яе прыгажосці паўстала для нашых гледачоў на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі. Яшчэ да афіцыйнага пачатку сезона, які адкрываецца заўтра прэм'ерай "Князя Ігара", тут двойчы былі паказаны "Ваяўніцы сям'і Ян" Кітайскага дзяржаўнага тэатра Пекінскай оперы. Суседства гэтых твораў розных культур надало ўсяму сезону калі не "ваяўнічасці", дык веры ў свае сілы і духоўную перамогу над складанымі абставінамі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Чым скарылі кітайцы? Найперш, асаблівай эстэтыкай. І, што вельмі важна, надзвычай высокім выканальніцкім майстэрствам. Да нас, і не адно ў сталіцу, за апошнія два дзесяцігоддзі неаднаразова наведваліся калектывы з Паднябеснай, дэманструючы падобнага роду спектаклі, але рознага ўзроўню — здаралася, нават пад фанаграму, у гэткім "сувенірным" варыянце. Цяперашні прыезд стаўся паказам сапраўднага нацыянальнага мастацтва без аніякіх "спрошчанняў". Госці імкнуліся да таго, каб мы максімальна глыбока ўніклі ў асаблівасці пекінскай оперы. З гэтай мэтай у Кітайскім культурным цэнтры ў Мінску напярэдадні была праведзена лекцыя — з вольным уваходам, для ўсіх жадаючых. На самім спектаклі бясплатна распаўсюджваліся праграмкі з найбольш важнымі звесткамі, а таксама буклеты, дзе быў цалкам змешчаны тэкст лібрэта. Дый падчас сцэнічнага дзеяння можна было без аніякіх праблем сачыць за рэплікамі кожнага персанажа — па бягучым радку. Там жа былі пазначаны і каментарыі "ад аўтара", і спасылкі на той ці іншы тып народных мелодый, якія ў пекінскай оперы прысутнічаюць абавязкова — як адзін з найгалоўных складнікаў жанру. Музыканты-інструменталісты змяшчаліся бліжэй да правай кішэні сцэны, схаваныя ад гледача завесай. Так, гэта не перашкаджала насалоджвацца непасрэдна сцэнічным дзеяннем з усімі яго відовішчнымі эфектамі, але беларускім музыкантам, якіх у зале было многа, так і хацелася зірнуць на аркестр, складзены з нацыянальнага інструментарыя.

Цікава было сачыць не толькі за музыкай і размоўнымі сцэнамі, максімальна набліжанымі да музычных, але і ўласна за опернай драматургіяй. Вось як у нашых гістарычных операх вырашаецца сцэна благой весткі, прынесенай падчас святочных балявання? Пасля доўгага разгорту ўслаўленняў і нацыянальных песень-танцаў раптам сціслы рэчытатыў (маўляў, ворагі напалі) — і ўсё, завеса ды антракт. Ці характарная сцэна (пераважна маршавая, адкрыта патрыятычная) збору ў ваенны паход. У пекінскай оперы ўсё было з дакладнасцю наадварот: доўгія прыгатаванні да свята, благая вестка — і неверагодна працяглае абмеркаванне, як лепей паступіць у гэтых абставінах.

Батальныя сцэны ў нашай опернай класіцы звычайна вырашаюцца праз музыку ўступу, інтэрмедыі ці ўвогуле выносяцца "за кулісы". Маўляў, адбыўся бой — вось яго вынікі. Альбо бітва ідзе недзе побач, па-за полем нашага зроку. А тут — наадварот: практычна ўся другая дзея — ваенныя паядынкі, што перапыняюцца хіба разважаннямі, як узяць ворага не сілай ды колькаснай перавагай, а розумам ды хітрасцю.

Да выкарыстання ў традыцыйных кітайскіх операх разнастайных прыёмаў усходніх адзінаборстваў мы ўжо прызвычаіліся. Але ў "Ваяўніцах сям'і Ян" ваенізаваныя сутычкі былі вырашаны зусім іначай — найперш праз энергічна акрабатычныя, амаль цыркавыя пасажы, нават клаўнаду. Ці, калі змагаліся жанчыны, праз зачаравальна грацыёзную танцавальнасць, спалучаную з надзіва мяккай хадой. І — ніякіх фінальных услаўленняў, грандыёзнай сустрэчы пераможцаў з масавымі харавымі "каланадамі". Перамаглі — і на бягучым радку ўзнікла сціслае: "Канец".

А якія шыкоўныя сцэнічныя строі! У некаторых з іх можна было без цяжкасці заўважыць "правобразы" дзіўных істотаў "Аватару" і іншых фэнтэзі. Аказваецца, тыя доўгія гнуткія "рожкі-вусы", прычэпленыя да некаторых касцюмаў, вырабляюцца з паўлінавых пёраў і вылучаюць ваеначальнікаў, вайсковае кіраўніцтва.

Будзем чакаць працягу абменных культурных мерапрыемстваў. Тым больш, што між многімі беларускімі і кітайскімі тэатрамі, іншымі ўстановамі, асобнымі дзеячамі мастацтва дзвюх краін наладжаны трывалыя творчыя сувязі.

Увага! Аб'ява*

Большой театр Беларуси

объявляет конкурс на замещение вакантных должностей в труппе оркестра

В группе 1-х скрипок: артист оркестра — 2 ставки.
В группе 2-х скрипок: артист оркестра — 1 ставка.
В группе альтов: артист оркестра — концертмейстер группы.
В группе контрабасов: артист оркестра — концертмейстер группы.
В группе ударных инструментов: артист оркестра — регулятор группы; артист оркестра — 1 ставка.
К участию в конкурсе допускаются лица, имеющие высшее или неоконченное высшее специальное музыкальное образование.

Конкурс состоится 29 октября 2019 года в помещении Большого театра Беларуси.

Документы принимаются до 22 октября 2019 года по адресу: г. Минск, пл. Парижской Коммуны, 1. Большой театр Беларуси (7-й подъезд, каб. № 433).

К заявлению необходимо приложить:
- копию документа о специальном образовании;
- справку с места работы или учебы;
- паспортные данные, адрес проживания, контактный телефон.

С дополнительной информацией можно ознакомиться на сайте театра: bolshoibelarus.by.

Справки по телефонам: гор. 8 017 335 44 43, мтс. 8 029 721 39 07, вел. 8 029 181 61 46.

Купіць-прадаць-пагуляць-паглядзець…

14 — 15 верасня Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" і MuzzicDom запрашаюць на кірмашовае свята. Прыкладна такія адбываліся ў 20 — 30-я гады мінулага стагоддзя. Гранд-кірмаш адбудзецца ў цэнтральным двары палацавага ансамбля.

Яўген РАГІН

Слоган мерапрыемства "Купіць-прадаць-пагуляць-паглядзець". У адпаведнасці з ім і будзе ладзіцца кірмашовая дзея. Гасцей сустрэне сам Альбрэхт Радзівіл з дачкой Эльжбетай.

З'едуцца беларускія рамеснікі. Так што шырокім будзе выбар твораў з керамікі, саломы, лазы, дрэва, металу і тканіны. Каштавалі суп з гарбуза? Кірмаш прапаноўвае такую магчымасць. Фермеры прывязуць свежы хлеб, сала, слімакоў(!), марынады, вяленыя слівы, гарбату, сыры. Ды ці мала яшчэ што!

Гарантуюцца легальная кантрабанда ад бутлегераў, рэтра-этнаэксклюзівы, майстар-класы, гульні, атмасферныя фотазоны, квэсты, музычныя праграмы.

Вітаецца дрэс-код у стылі 20 — 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Вадзім КАЧАН:

"Я патрапіў у Верхні горад — і быў зачараваны"

1980-я — 2000-я ў аб'ектыве вядомага фатографа

"Сёння Мінск пры ўсіх складанасцях нараджаецца як еўрапейская сталіца", — фатограф Вадзім Качан ужо больш за трыццаць гадоў здымае наш горад на Свіслачы, адзначаючы яго змены ў абліччы. Але асабліва блізкія аўтару 1980-я — вінтажныя, супярэчлівыя, вырашальныя… Фатограф здымаў тое дзесяцігоддзе несупынна — і сёння мы маем магчымасць параўнаць "чорна-белы" Мінск "эпохі застоя" і Перабудовы, і мегаполіс 2010-х, які імкліва мяняецца. 12 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстава вядомага фатографа пад назвай "Мінск. Горад і час", у якой аўтар сутыкае мінскія выявы розных гадоў. Сустрэўшыся напярэдадні вернісажу, "К" распытала мастака пра яго архівы, фатаграфію, ды самае любімае месца ў сталіцы, што сёлета святкуе свае 952 гады.

Вадзім Качан. "Тэлефонная будка". 1988 год.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ /

АМАЛЬ СЫШОЎ

Стос кніг з выявамі Мінска 1980-х. Ды яшчэ альбомы "Фатаграфіі мінулых гадоў", "Мінск. Горад і людзі", іншыя выданні. Горад вачыма Вадзіма Качана, здаецца, ужо пазнавальны брэнд краіны, але, быў момант у біяграфіі аўтара, калі ён амаль сышоў з фатаграфіі.

— Так, вы маеце рацыю, гэта было ў 1990-х, — прызнаецца ён. — Я вырашыў завяршыць фатаграфічную кар'еру, ды нават пайшоў на сметніцу выкідаць адбіткі, што стварыў за мінулыя дзесяцігоддзі.

— ?!

— Частку матэрыялу такі і выкінуў, а частку — захаваў. Сябра спыніў. Кажа: "Лепш не выкідай, а пакінь на гарышчы. Праз пэўны час паглядзіш". І я, дзякуй Богу, паслухаўся. Зараз, гледзячы на захаваныя здымкі, разумею, што тады моцна сябе недаацаніў (смяецца).

"Праводзіны зімы". 1986 год.

— Архіў застаўся вялікі?

— Больш за тысячу негатываў, мяркую, што так, нягледзячы на згубленае. І вось гэтыя стосы кніг — спробы з імі працаваць. Ёсць у мяне дакументальная фатаграфія, і мантажная, так бы мовіць, канцэптуальная. Усё цяпер глядзіцца цікава.

Заканчэнне — **на старонцы 13.**

"Гісторыі на гарадскіх лаўках".1984 год.

На маю думку

Больш, чым проста забава

Тэмай сёлетніх Дзён еўрапейскай спадчыны стала "Спадчына і забава". Прыдумалі дык прыдумалі. А я, карыстаючыся момантам, хачу заклікаць задумацца пра сур'ёзнае. Сапраўды, мы, людзі, якія займаюцца спадчынай прафесійна, неяк звыкліся, што галоўным змястам гэтай працы з'яўляецца адстойванне права на захаванне памяці, прыняцце складаных рэстаўрацыйных рашэнняў, палкія спрэчкі. А з іншага боку — памяць сівых вякоў, гераізм і мудрасць продкаў. Якія тут жарты?

Між тым, так гэта толькі для нас. Даўно ўжо сфарміраваўся, так бы мовіць, іншы бок барыкад. Для абсалютнай большасці людзей спадчына з'яўляецца элементам індустрыі забаў і вольнага часу. Вось той жа турызм. Тут спадчына канчаткова трансфармавалася ў прадукт і ацэньваецца ў катэгорыях спажывання — не столькі па высокіх культурных крытэрыях, колькі па эканамічных паказчыках.

Яна стала таварам, ператварылася ў атракцыён. Нават дысанансная спадчына — закінутыя пасля чарнобыльскай катастрофы паселішчы або бункеры часоў "Халоднай вайны"... Раней іх бы знішчылі, а сёння — паспяхова "прадаюць" турыстам.

У 1790 годзе парыжане разбурылі ўзятую штурмам Бастылію. Якая памылка! У наш час яе, без сумневу, ператварылі б у музей!

У расійскага рэжысёра Сяргея Лазніцы ёсць дакументальны фільм "Аўстэрліц", названы так зусім не з-за Напалеона. Падзеі адбываюцца на тэрыторыі былых нацысцкіх канцлагераў, якія дзейнічаюць у якасці музеяў-мемарыялаў. У цэнтры ўвагі не самі лагеры ці іх гісторыя, а людзі, якія іх наведваюць. Сем'і з дзецьмі ў летні дзень робяць сэлфі на фоне печаў крэматорыяў. Яны ходзяць у кароткіх шортах, смяюцца, абедаюць, загараюць, паводзяць сябе так, быццам трапілі ў Дыснэйлэнд. Што за дзіўная сіла прымушае іх праводзіць выхадны дзень у канцлагеры? Няма адказу...

Уварванне масавай культуры ў сферу працы са спадчынай прыводзіць да негатыўных наступстваў — наіўнасці, некрытычнасці, нізкага мастацкага ўзроўню. Пры гэтым, ацэншчыкам работы са спадчынай становіцца эксперт, а канчаткова спажывец, не надта абцяжараны веданнем прадмета.

Гэта раней элітарнае спажыванне спадчыны абапіралася на сілу чалавечага ўяўлення. Людзі культуры падарожнічалі ў Грэцыю або Італію, каб там, на руінах — сведках мінулага хараства — чытаць Гамера ці Вяргілія (вядома, у арыгінале!). Сёння большасць аддае перавагу аўтобусным турам у стылі "сем дзён — восем краін", а потым блытае, дзе ж стаяў той прыгожы касцёл: у Вене ці ў Празе?

Спадчына, прысутнічаючы на канкурэнтным рынку культурных прадуктаў, цяпер павінна ўлічваць чаканні спажыўцоў, трапляць пад класіфікацыі, стаяць ва ўсемагчымах рэйтынгах ("Сем цудаў Беларусі" або нават Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА — якраз такія). Яна адпавядае катэгорыям фармату, узроставай цэнзуры, аўтарскага ды іншага права. Апафеозам стала "брэндзіраванне", якое закранула ўжо і беларускія гарады.

Усё гэта прыналежыць больш да маркетынгу і прасоўвання продажаў, чым да гістарычнай інтэрпрэтацыі. Музейшчыкі, рэстаўратары, мастацтвазнаўцы і гісторыкі ўваходзяць у неўласцівыя ім ролі менеджараў, прадзюсараў і шоуменаў. Калі экскурсавод не апрануты ў касцюм польскага афіцэра, нашто мы наогул прыехалі!? Дзіўна, як хутка постсавецкая Усходняя Еўропа прайшла гэты шлях ад самааддаванай грамадскай абароны помнікаў да іх дыснэйлэндызацыі.

Ды што я такі злы... Чаму б, урэшце, не паскакаць на "Мотальскіх прысмаках", не набыць магніцік з Горадні, не паслухаць байкі пра савецкі Мінск? А тут яшчэ танныя квіткі ў Рым "выкінулі". Хто адмовіцца ад добрай піцы — элемента нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва. З'ем, мо і палягчае...

Шануйце спадчыну, яна больш, чым проста забава!

Сцяпан СТУРЭЙКА,
старшыня праўлення Беларускага камітэта ICOMOS

На тэрыторыі Беларусі да пачатку Першай сусветнай вайны існавала больш за 300 паркаў. Большую іх частку складалі пейзажныя ансамблі пры сядзібах, якія знаходзіліся ў сельскай мясцовасці. На сённяшні момант з іх захавалася крыху больш за 120. Пасля рэвалюцыі, перадзелу маёмасці, войнаў многія паркі засталіся без неабходнага догляду і здзічэлі. Астатнія атрымалі значныя планіровачныя і кампазіцыйныя перамены: разбураны архітэктурныя збудаванні, водныя сістэмы, змяніўся склад насаджэнняў. Дык ці магчыма аднавіць ландшафтную спадчыну краіны?

"Так сумна-сумна ў цішыне..."

Настасся ПАНКРАТАВА

Рэвіталізацыя гістарычных паркаў: мары і рэальнасць

КОМПЛЕКС ЁСЦЬ — ПАРКУ НЯМА

Гэтым летам сям'ёй мы шмат падарожнічалі па Беларусі: хацелася паказаць дзецям, што не адным Нясвіжскім комплексам ды Мірскім замкам багатая краіна. Дабраліся да маючага кінематаграфічную славу палаца Святаполк-Чацвярцінскіх у гарадскім пасёлку Жалудок, што на Навагрудчыне. Будынак архітэктара Марконі сапраўды ўражвае, вось толькі ісці да яго даводзіцца ўздоўж зараснікаў хмызняку і "натоўпу" дрэваў, у якіх наўрад ці пазнаеш абрысы колішняга пейзажнага парку. Калісьці яго закладвалі па тыпу лепшых еўрапейскіх узораў, сёння ж захаваліся хіба толькі рэшткі прамой выяздной алеі, што з'ядноўвала рэзыдэнцыю князёў з цэнтральнай плошчай паселішча. Сам парк даўно здзічэў, былыя ландшафтныя задумы сталі непрыкметнымі за-за хаатычнасці пасадак другой паловы XX-га стагоддзя ды цяперашнім самасевам.

Не менш сумная карціна сустрэла нас у маёнтку Храптовічаў у Шчорсах. У XVIII стагоддзі вакол палаца прыгажэў шыкоўны англійскі парк. Ён займаў звыш сарака гектараў зямлі, на якіх можна было пабачыць больш за 200 відаў раслін. Тут жа для здзіўлення наведвальнікаў была створана каскадная сістэма азёр. У нашыя дні занядбаны людзьмі ландшафт стаў нагадваць звычайны лес, а сажалкі хутчэй назавуць балотам, чым водным люстэркам.

Прыклады можна працягваць. Нехта скажа: тут хоць самі палацы зберагчы, ужо не да мудрагелістых пешаходных сцежак ды ў дзікім парадку насаджанных дрэў. Не пагаджуся, бо паркі таксама з'яўляюцца помнікамі, што дасталіся нам у спадчыну ад продкаў. Памятаю, як заязджаючы да родзічаў у Станькава, заўсёды бегла да былой сядзібы Чапскіх, каб у чарговы раз зачаравацца экзатычнымі дрэвамі, што растуць дагары нагамі. Тыя вязы, якім фантастычную форму некалі надаў графскі садоўнік-віртуоз, доўгі час былі сапраўдным гонарам мясцовых жыхароў. Я сама ў дзяцінстве ўпрошвала па сотаму кругу пераказаць легенду, звязаную з тутэйшымі цікавосткамі з сімвалічнымі імёнамі Вера, Надзея і Любоў. Як жа я плакала, калі ў чарговы прыезд не знайшла родных мне ўжо дрэваў — напрыканцы нулявых загінуў апошні з трох ствалоў. Думаю, не я адна такая сентыментальная: з імі адышоў у нябыт яшчэ адзін кавалачак тутэйшай гістарычнай памяці. Дык ці магчыма вярнуць Беларусі былыя ландшафтныя дасягненні?

"Масакру" здымалі ў здзічэлым наваколлі ля палаца Святаполк-Чацвярцінскіх.

Былая сістэма каскадных азёр у Шчорсах сёння ў занядбанні.

30-ЦЬ З НЕКАЛЬКІХ СОЦЕНЬ

На мінулым тыдні Таварыства беларускай мовы, што цяпер святкуе 30-годдзе з дня свайго заснавання, сабрала ўсіх датычных на навукова-практычную канферэнцыю "Нашы вякі — наша багацце. Лепшыя практыкі захавання спадчыны". Сярод выступоўцаў быў доктар архітэктуры, загадчык кафедры "Горадабудаўніцтва", прафесар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Георгій Патаеў. Ён не ў першы раз звяртае ўвагу шырокай аўдыторыі на неабходнасць рэвіталізацыі гістарычных паркаў Беларусі.

— 40 гадоў таму Беларускім навукова-даследчым і праектным інстытутам горадабудаўніцтва было праведзена комплекснае даследаванне стану пейзажных ансамбляў краіны. У выніку архітэктары распрацавалі інструкцыю па аднаўленні старадаўніх помнікаў садова-паркавага мастацтва краіны, — прыгадаў прамоўца. — Аднак час мінуў, а са 120-ці захаваных у нас паркаў аднаўлена і актыўна выкарыстоўваецца хіба, калі тры дзясяткі.

Колькі могуць чакаць астатнія? Спадар Патаеў прыгадаў, што многія штучныя пейзажы ствараліся ў XVIII — XIX стагоддзях, гэта значыць, што зараз у дрэў наступае час натуральнага старэння і адмірання. Хутка знікнуць тыя прыродныя вешкі, па якіх можна было аднавіць некалі задуманую архітэктарам кампазіцыю. Марнаваць час дакладна нельга.

Сярод станоўчых прыкладаў прафесар архітэктуры называе рэканструкцыю паркавага комплексу ля палаца Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, а таксама падыход прыватнікаў да аднаўлення сядзібы Агінскіх у Залессі. А вось варыянты працы з зялёнымі ансамблямі ў сталіцы спадар Патаеў лічыць не заўсёды ўдалымі.

— Добра, што архітэктарам дазволілі заняцца Лошыцкім паркам. У яго гістарычнай частцы нямала цікавостак. Толькі вось пакуль дойдзеш туды праз плошчы навабуду і безгустоўя, дык можна згубіць прагу да азнаямлення з рэшткамі старадаўняй спадчыны.

Георгій Аляксандравіч паказаў карту краіны, на якой адзначаны паркі, якія яшчэ можна выратаваць. Аказалася, што большасць з іх месціцца ў заходняй частцы

Беларусі. Выступоўца прыгадаў, што 45 з іх маюць статус помніка прыроды нацыянальнага значэння. Тым не менш многія з ландшафтных ансамбляў знаходзяцца ў сумным становішчы. І гэта датычыцца не толькі малавядомых месцаў.

— Возьмем да прыкладу адзін з самых папулярных у турыстаў аб'ектаў — Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс Радзівілаў, які ўваходзіць у спіс сусветнай культурнай спадчыны UNESCO. У ім шмат чаго было зроблена, аднак непасрэдна парк мае патрэбу ў якаснай рэканструкцыі.

Прычыны таго, што сёння адсутнічае праграма комплекснага падыходу да рэвіталізацыі бачыць менавіта ў тым, каб ізноў перадаць знікаючыя абшары ў рукі зацікаўленых прыватнікаў. Дарэчы, сусветны вопыт гаворыць пра такі ж шлях да рэвіталізацыі зялёнай спадчыны.

У прыклад Георгій Аляксандравіч прыводзіць арт-сад "Юпіцер", які знаходзіцца ў мястэчку Банінгтон усяго ў некалькіх кіламетрах ад Эдынбурга — сталіцы Шатландыі. Да пачатку бягучага стагоддзя гістарычныя рэгулярныя сады і пейзажны парк Банінгтона знаходзіліся не ў лепшым стане. У 2001-м годзе маёнтак набыў уладальнік фармацэўтычнай кампаніі. Разам з жонкай-скульптарам ён не толькі аднавіў гістарычнае аблічча мястэчка, але і надаў паркаў, зразумелыя: для працы ў архівах, аднаўлення былой структуры на даволі вялікіх плошчах, яе аховы і догляду неабходны немалыя сродкі. А калі не атрымаецца іх закласці ў бюджэт? Дык няўжо нам застанецца толькі назіраць, як знікае тое, што ўзводзілася рукамі продкаў?

Сучасны арт-аб'ект у рэгулярным парку са шматвекавой гісторыяй.

"Халмы жыцця" Чарльза Джэнкса атачаюць пад'язную шашу ў арт-сад.

Фота з сайта gardener.ru

У "Юпіцеры" на кожным кроку сустракаюцца цікавосткі.

клічуць садам скульптур, аднак задума ў заснавальнікаў больш грандыёзная. Тут адзін за адным ладзяцца шматлікія арт-праекты. Напрыклад, пад'язны шлях той жа Джэнкс аздобіў штучнымі вадаёмамі, насыпнымі берагамі і спіральнымі ўзвышэннямі. Гэтыя "Пагоркі жыцця" сталі адной з візітовак мясцовасці. Для наведвальнікаў ландшафтныя інсталяцыі становяцца своеасаблівай адукацыйнай пляцоўкай у галіне сучаснага мастацтва.

Для Беларусі такі замежны досвед можа быць вельмі карысным. Спадар Патаеў упэўнены, што для вырашэння мусіць прыцягнуць прыватных інвестараў. Толькі для гэтага кроку неаходна ўдасканаліць заканадаўства і распрацаваць меры для стымулявання донараў, гатовых укласці сродкі ў захаванне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.

ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ

Спадар Патаеў нагадвае, што паркі заўсёды звязаныя з гісторыяй і культурай краіны. Мусіць толькі ўзняць архіўныя дакументы — і абавязкова высветліцца, што па тутэйшых алеях хадзіў слынны беларускі паэт, у ценю двухсотгадовага дуба натхняўся краявідамі знакаміты кампазітар, а ўздоўж возера шпацыраваў хлопчык, які хутка вырасце ў вядомага дзеяча, які паўплывае на лёс краіны. Разам з клумамі і дрэвамі знікае каштоўная частка ведаў пра айчынную культуру і гісторыю. Таму проста неабходна не толькі супрацоўнічаць з прыватнікамі, але і распрацоўваць дзяржаўную праграму рэвіталізацыі гістарычных паркаў.

— Стратэгія аховы і аднаўлення павінна быць доўгатэрміновай. Для гэтага ўсім датычным неабходна сумесна выявіць і ранжыраваць праблемы, якія мы ўжо маем на сёння, — удакладняе сваю пазіцыю прафесар архітэктуры. — Як толькі мы вызначым прыярытэты і пазначым этапы, неабходныя для аднаўлення і рэвіталізацыі паркаў, можна будзе прыступаць да першачарговых мерапрыемстваў. Мне падаецца, вельмі эфектыўнымі былі б азнаямленчыя паездкі, мэтавыя семінары і так далей непасрэдна для кіраўнікоў усіх узроўняў. Бо многія з іх нават не здагадваюцца пра існаванне разглядаемай намі праблемы. Магчыма, актывізацыі працэсу дапамог бы штогадовы конкурс накшталт "Лепшы аднаўлены гістарычны парк", які б стымуляваў улады гарадоў і мястэчак да работы ў дадзеным напрамку.

Дарэчы, папулярызаваць гістарычныя паркі трэба і сярод насельніцтва. Георгій Аляксандравіч спасылаўся на тэлебачанне, якое пачало актыўна здымаць перадачы пра падарожжы па Беларусі. Архітэктар марыць пра аналагічныя праграмы па садова-паркавых аб'ектах.

Пагадзіцеся, паркі — такая ж частка нашай гісторыі, як і фасады растыражаваных збудаванняў, што глядзяць на нас з сувенірных паштовак. Да таго ж яны могуць быць не толькі месцам для рэлаксацыі, але магнітам, які прыцягвае турыстаў і прыносіць грошы. Верагодна, яны сталі б яшчэ адной пазабюджэтнай крыніцай, якую можна накіроўваць на ўтрыманне рэгуляванага пейзажу, а таксама на рэстаўрацыю гістарычных будынкаў. Здаецца, і сапраўды прыйшоў час дзейнічаць.

К

Дзяжурны па нумары

Не прагнеш эфекта "ваў"

Не раз мне казалі: чым далей ты жывеш, тым марудней адчуваецца час. Не магу з гэтым пагадзіцца. Прынамсі, тут і цяпер. У Мінску час ідзе неяк ажно занадта ўжо хутка. Я вось не так даўно і жыву, але цудоўна памятаю, як выглядаў гадоў -нацаць таму Верхні горад, і як на Кастрычніцкай за ўвесь суботні вечар можна было не сустрэць ні душы.
Усё змянілася літаральна вокамгненна, быццам фея махнула чароўнай палачкай. Тэхналогіі, незлічоныя прапановы індустрыі забаў, звыклы для мегаполіса рэкламны гул… Урэшце, мы настолькі хутка прызвычайваемся да несупынных зменаў, што развучваемся здзіўляцца.
І на такім тле нават цяжка ўцяміць, якім павінна быць мастацтва, каб мець права называцца перадавым — так бы мовіць, у авангардзе. І ці трэба яму наогул такім быць?

Ілья СВІРЫН

Адзін з фрэндаў прыгадаў у сваёй стужцы, што акурат у пачатку верасня было 20-годдзе фестывалю перформанса Novinki. Добра памятаю тыя натоўпы гледачоў, што цягнуліся ў Палац мастацтва. На той час гэта быў сапраўдны культурны выбух: у Мінск з'ехаліся мастакі з усяго свету. Дзясяткі публікацый і рэпартажаў, бурлівы розгалас, эмацыйныя дыскусіі...

Цяпер такое нават цяжка сабе ўявіць. Сёння Мінск настолькі перанасычаны размаітымі культурнымі падзеямі, настолькі да ўсяго прызвычаіўся, што кагосьці здзівіць — або хаця б прыцягнуць чыю-кольвечы ўвагу — стала архіскладана. І таму новы міжнародны фестываль Performensk, які перахапіў эстафету ў даўно зачахлых ды спачылых "Навінак", сабраў на мінулым тыдні, здаецца, болей удзельнікаў, ніж гледачоў. Такая з'ява для замежных фэстаў — ужо бадай завядзёнка. Цяпер і для нас таксама.

Тады, у дзевяностыя, здавалася, што галоўная задача мастацтва — паскорыць хаду часу, даць яму выспятка. Перформанс (а гэтае слова стала ў нас звыклай метафарай для вызначэння чагосьці шалёнага і яркага) успрымаўся як увасабленне падобных памкненняў. Менавіта таму ён і прыцягваў такую ўвагу. І многія расчароўваліся, даведаўшыся, што гэта ўсяго толькі яшчэ адзін від мастацтва, які далёка не заўсёды можа выклікаць шок.

Сёлета Performensk быў прысвечаны доўгатэрміновым дзеям: калі амаль нічога не адбываецца. Скажам, пасярод залы ў Музеі Заіра Азгура знаходзіцца стог сена, а ў ім амаль цалкам схаваны сівы чалавек. І так цягам дзвюх гадзін (прынамсі, паводле раскладу, я асабіста не правяраў). Гэта поўны антыпод шоу. Але раптоўна я заўважыў, што назіранне за тым, як 76-гадовы ірландскі прафесар Аластар Макленан на нейкі час замарудзіў свае жыццёвыя працэсы, мае прынамсі тэрапеўтычную карысць.

Сёння, як па мне, паскараць час ужо няма ніякай патрэбы: ён і так імчыць бы гоначная машына па аўтабане. І ў гэтым калейдаскопе дужа цяжка засяродзіцца хоць на хвілінку. Таму сёння ўжо не прагнеш мастацтва, здатнага здзіўляць і шакаваць, вокамгненна выклікаць эфект "ваў": яго і так даволі. Наадварот, вельмі радуешся кожнай магчымасці засяродзіцца. Скажам, мне падабаецца падоўгу праходжвацца па пустэльнай зале галерэі, дзверы ў якую адчынілі мне спецыяльна: галерэй у нас сёння паназ'яўлялася багата, а публікі, здаецца, наадварот паменела. Люблю, калі музейны наглядчык уключае мне святло.

Вельмі рады, што такія месцы здатныя запаволіць час, вырваць цябе з бурлівай мітуслівай плыні. Займець хоць нейкі "Час цішыні". Нагадаю, так называецца вядомая карціна Бялыніцкага-Бірулі — мастака-эскапіста, які правёў ці не самы шалёны ў сусветнай гісторыі час (вайна, рэвалюцыя, вайна, рэпрэсіі, вайна...) з пэндзлем у руцэ на беразе возера.

Не заклікаю следаваць ягонаму прыкладу. Але хаця б кароткі час цішыні нам, без сумневу, патрэбны.

К

Абярэг ад бездухоўнасці

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ /
Фота аўтара

У ліпені бягучага года пры Інстытуце філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі створаны Цэнтр філасофіі культуры. Пра дзейнасць установы, нацыянальныя мастацкія традыцыі, гуманітарную бяспеку краіны ды многае іншае "К" пагутарыла з загадчыкам Цэнтра, былым першым прарэктарам Беларускай акадэміі мастацтваў, доктарам філалагічных навук, прафесарам Валерыем МАКСІМОВІЧАМ.



— Валерый Аляксандравіч, у чым, на ваш погляд, важнасць стварэння згаданага Цэнтра для нашай краіны? Якімі пытаннямі і праблемамі будуць займацца яго супрацоўнікі?

— Стварэнне Цэнтра, на мой погляд, адкрые больш магчымасцяў сістэмна даследаваць філасофска-метадалагічныя праблемы культуры як сацыяльнага феномена, у тым ліку нацыянальнай культуры ў кантэксце сацыякультурных трансфармацый. У полі зроку даследчыкаў будуць знаходзіцца такія найважнейшыя праблемы сучаснай цывілізацыі, як дэвальвацыя духоўных каштоўнасцяў і рост спажывецкіх настрояў, крызіс рэлігіі і экспансія масавай культуры, уплыў глабалізацыйных працэсаў і інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій на працэс фарміравання духоўнай культуры асобы ды многія іншыя пытанні.

— Але наколькі цяжка было стварыць такі Цэнтр? Ці доўга вы ішлі да гэтай мэты?

— Калі быць шчырым, ініцыятарам стварэння гэтага цэнтра выступіў Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў. Дарэчы будзе сказаць, што Уладзімір Рыгоравіч надае значную ўвагу развіццю філасофскай навукі, увогуле гуманітарных ведаў. Бо, сапраўды, ад стану развіцця гуманітарыстыкі ў многім залежыць духоўны ўзровень грамадства. Неабходнасць стварэння згаданага структурнага падраздзялення ў Інстытуце філасофіі прадыктаваная самім часам, рэаліямі жыцця. І не толькі таму, што ў сферы культуры, у сацыякультурным жыцці адбываюцца неадназначныя працэсы. Не сакрэт, што з-за розных несумленных прапагандысцкіх маніпуляцый масавай свядомасцю, інфармацыйнымі патокамі спаквяла ідзе размыванне нацыянальнага менталітэту, падрываюцца асновы жыццядзейнасці грамадства ўвогуле. І варта даць усяму гэтаму навуковую ацэнку, знаходзіць дадатковыя рэсурсы, якія б садзейнічалі стабілізацыі духоўнай, сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў грамадстве.

— Ці ёсць падобныя Цэнтры за мяжой, скажам, у Еўропе, у краінах СНД? На вопыт якіх краін вы абапіраліся, ствараючы Цэнтр?

— Безумоўна, ёсць. Бо кожны разумее, што ад стану культуры, ад ідэнтыфікацыйнага статусу чалавека, ад яго ўнутранага самаадчування залежыць і стабільнасць усяго грамадства, і яго будучыня. Гэта адзін з дзейсных складнікаў ахоўнага і адаптацыйнага механізма, які спрыяе забеспячэнню і захаванню сталых сацыяльных сувязей, адпаведнага маральна-псіхалагічнага клімату, псіхаэмацыянальнага балансу. На вопыт якіх краін пакладаліся? Ды, зрэшты, у нас маецца і свой уласны багаты і павучальны вопыт. У інстытуце доўгі час існавала падобнае структурнае падраздзяленне. Таму мы, па сутнасці, узнаўляем найперш сваю традыцыю, але, бясспрэчна, будзем браць на ўзбраенне і дасягненні нашых калег з блізкага і далёкага замежжа.

— Наколькі я разумею, склад супрацоўнікаў Цэнтра на сёння толькі фарміруецца?

— Так, бо, на вялікі жаль, у Беларусі спецыялістаў, якія могуць на высокім прафесійным узроўні займацца падобнай праблематыкай, рабіць якасную навуковую аналітыку, не так ужо і шмат. Трэба падбіраць і рыхтаваць кадры. Гэта справа не аднаго дня. Але ўжо цяпер магу сказаць, што ва ўстанове будуць працаваць дасведчаныя спецыялісты, пераважна дактары навук, якія не першы год займаюцца падобнымі пытаннямі.

— Якімі канкрэтна?

— Скажам, важны кірунак даследавання — вызначэнне аксіялагічнага кампанента нацыянальнай культуры як дзейснага інстытута ўплыву на ўсе сферы грамадства. Як я адзначаў, сёння ў свеце разгортваецца ідэйна-палітычнае проціборства, ідуць інфармацыйныя войны рознага маштабу, шырока распаўсюджваюцца тэхналогіі маніпулявання масавай свядомасцю і кіравання паводзінамі людзей. У гэтай сувязі аксіялагічны патэнцыял нацыянальнай культуры характарызуецца надзвычайнай запатрабаванасцю і актуальнасцю.

— А тэма эрозіі духоўных каштоўнасцяў, росту спажывецкіх настрояў, крызісу рэлігіі ды іншыя тэмы, пра якія вы ўжо згадвалі вышэй?

— Безумоўна, усе пералічаныя ды многія іншыя тэмы стануць прадметам даследавання. Зрэшты, магчымы вектар даследаванняў прадыктаце само жыццё, стратэгія развіцця навукі. Шмат што будзе залежыць ад навукова-даследчага досведу і кампетэнцый супрацоўнікаў. Галоўнае, каб панавалі ўзаемаразуменне і падтрымка з боку кіраўніцтва, усведамленне таго, што ўсе мы робім агульную справу на карысць нашай навукі, нашай незалежнай Беларусі.

— Ці ёсць над чым працаваць ужо цяпер?

— У бліжэйшы час супрацоўнікі Цэнтра прыступяць да рэалізацыі асобнага навукова-даследчага праекта "Нацыянальная культура ў кантэксце сацыякультурных трансфармацый". У выніку будзе прааналізаваны значны корпус найноўшых філасофска-культуралагічных і гісторыка-культурных даследаванняў па дадзенай праблематыцы, звернута ўвага на спецыфіку і механізмы функцыянавання нацыянальнай ідэнтычнасці на прыкладзе рэканструкцыі элементаў нацыянальнай міфалогіі і фальклору, літаратурна-мастацкіх узораў. У полі зроку — і праблемы сацыяльна-культурнага і духоўна-маральнага развіцця як неабходнай умовы кансалідацыі беларускага грамадства, забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Па выніках даследавання мяркуецца выдаць калектыўную манаграфію.

— Якраз і хацеў перавесці гаворку на манаграфіі. Днямі з друку выйшла ваша кніга "Нацыянальная мастацкая традыцыя ў кантэксце гуманітарнай бяспекі Беларусі". У сувязі з чым у вас узнікла цікавасць да падобнай тэмы?

— Справа ў тым, што я перакананы: ад таго, наколькі мы здолеем зберагчы, захаваць нашы нацыянальныя традыцыі, нашу гістарычную памяць, будзе залежыць і наша паспяховае і стабільнае заўтра, зладжанасць, згармані-заванасць нашага жыцця ўвогуле. На жаль, сёння мне часта даводзіцца чуць песімістычныя размовы пра недзеяздольнасць традыцыі, у тым ліку традыцыі мастацкай. Я сыходжу з адваротнага і лічу, што класіка ў сваім сумарным выражэнні складае залаты фонд кожнай нацыянальнай культуры. Яна не дае нам забыцца на тое, хто мы ёсць, дзе нашы карані, якое наша галоўнае паклікане і прызванне. Таму і вырашыў яшчэ раз у манаграфіі звярнуць увагу на неабходнасць фарміравання паважлівых адносін да сваёй гісторыі, гісторыка-нацыянальных святынь, сімвалаў, паразважаць над асаблівасцямі культуратваральных працэсаў у Беларусі, разгледзець некаторыя аспекты станаўлення інтэлектуальнай культуры.

— Але чаму так важна звяртаць увагу на гэтыя акалічнасці менавіта сёння?

— Мяркую, прычын для таго шмат. Скажам, цяпер нямала пішуць і гавораць пра глабалізацыю, пра ўваходжанне ў новую стадыю цывілізацыйнага развіцця. На мой жа погляд, глабалізацыя стварае пагрозу чалавечай ідэнтычнасці, вядзе да татальнай уніфікацыі, стандартызацыі жыцця, "тыповага" выбару. Супрацьвагай усяму гэтаму можа выступіць і выступае мастацкая, а ў больш шырокім плане, культурная традыцыя. Гэта своеасаблівы абярэг ад наступу бездухоўнасці, бяздушнасці, моцны сродак захавання экзістэнцыйнай прасторы асабістай ідэнтычнасці, духоўнай аўтаномнасці. Мастацкая традыцыя, што вельмі важна, спрыяе псіхалагічнай пераемнасці, засваенню і трансляцыі культурнай матрыцы, алгарытму мыслення, думання, паводзін, учынкаў і жыццёвых арыенціраў.

— А як звязана нацыянальная мастацкая традыцыя і гуманітарная бяспека Беларусі?

— Самым непасрэдным чынам. Мастацкая класічная традыцыя паказвае прыклад гуманных адносін, дэманструе не ўяўную, а сапраўдную духоўнасць, маральную чысціню, сумленнасць, чалавечнасць. І ў такой сваёй іпастасі выступае сістэмаўтваральным фактарам гуманітарнай бяспекі, больш за тое, складае ядро культурнай палітыкі. У класіцы закладзена шмат актуальных і сёння ідэй — ідэя духоўнага суверэнітэту, годнасці і гонару, свабодалюбства, грамадзянскай згоды, адзінства. Стрыжнёвай выступае ідэя нацыі як стваральнай сілы, без чаго немагчыма духоўная інтэграцыя беларусаў, нацыянальная дзяржаўная супольнасць увогуле.

— Але ж, на жаль, у сённяшняга чытача класіка не ў вялікай пашане. Ці засталіся яшчэ свядомыя аматары айчыннай класікі? А без падобных аматараў пра гуманітарную бяспеку можна толькі марыць.

— У вашых развагах ёсць пэўная, так бы мовіць, доля праўды. Але ж гэта тэма для іншай, асобнай размовы. Тут толькі заўважу, што шмат у чым тое выдаткі постмадэрновага часу — закрэсліць, прыцямніць папярэднікаў, каб навязаць сваё, "альтэрнатыўнае" бачанне жыцця. У маёй кнізе ёсць развагі і на гэты конт. Упэўнены, што пры ўсіх абставінах і акалічнасцях хрэстаматыйныя, узорныя творы ў сілу аб'ектыўных законаў трапляюць у разрад канцэптуальных, эталонных нацыянальна-культурных знакавых кодаў, якія фарміруюць наш светапогляд, набываюць сталае культурна-гістарычнае значэнне і ментальную ўстойлівасць сярод носьбітаў пэўнай культурнай традыцыі. Творы Купалы, Коласа, Багдановіча, Гарэцкага, Чорнага, Мележа, Караткевіча, Быкава, іншых нашых выбітных аўтараў складаюць значны пласт нацыянальнага мастацтва, аднесены да разраду феноменаў, якія аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне нацыянальнага культурнага кантэксту. Праз іх мы спасцігаем нацыянальную гісторыю, яе субстанцыяльна-філасофскі сэнс і, у выніку, больш разумеем сябе сённяшніх.

К

> *Не сакрэт, што з-за розных несумленных прапагандысцкіх маніпуляцый масавай свядомасцю, інфармацыйнымі патокамі спаквяла ідзе размыванне нацыянальнага менталітэту, падрываюцца асновы жыццядзейнасці грамадства ўвогуле.*

Вечна малады беларускі Фаўст

Фота Яўгена КОЛЧАВА

Арлен Кашкурэвіч… Імя гэтага творцы, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі краіны, вядомае не толькі на нашай зямлі, але і ў многіх кутках планеты, куды далятаў ягоны шчыры мастакоўскі голас. 15 верасня 2019 года ён мог бы адзначыць сваё 90-годдзе, але не дажыў да гэтага юбілею шэсць гадоў.

Дык у чым унікальнасць яго таленту? Якую спадчыну ён пасля сябе пакінуў нам, нашым дзецям і ўнукам? Думаю, што такія пытанні не патрабуюць складанай галаваломкі. Таму што ягоная творчасць — гэта настойлівы пошук адказу на вечнае біблейскае пытанне чалавецтва: "Што ёсць ісціна?" Эсхаталагічны роздум аб лёсах свету і чалавека — асноўны ў светапоглядзе сістэме мастака, што б той ні ствараў: станковыя графічныя цыклы ці мастацкае афармленне кніг, экслібрысы ці асобныя аркушы. Ва ўмовах сусветнай нестабільнасці, маральнага крызісу і сацыяльных катаклізмаў ён з усёй вастрынёй ставіў перад людзьмі філасофска-маральныя катэгорыі дабра і зла, любові і нянавісці, святла і цемры, вайны і міру. І ў гэтым плане Арлен Кашкурэвіч займае асаблівае месца не толькі ў беларускай выяўленчай культуры.

Яшчэ напачатку 1970-х, яго вострадраматычная сюіта афортаў "Партызаны" выклікала сапраўдны фурор не толькі ў нас, але і ў тых замежных краінах, дзе была паказана. "Партызаны" Кашкурэвіча — у той жа час сімвалічны сігнал маладому пакаленню, якому, на жаль, уласціва забываць сваю гісторыю. І таму да партызан нельга ставіцца як проста да сюжэтнай ілюстрацыі пэўнага канкрэтнага эпізода ваеннага жыцця. Пра музыку, бывае, кажуць: філасофскія роздумы. Вось і тут: філасофскія роздумы — то гнеўныя, то элегічныя, то паэтычныя, то нават лірычнага складу. Яны абуджаюцца дачыненнем да сённяшняга свету. Яны — як боль, які ўбачаны за даўнасцю гадоў, горкі ды высокі боль, і памяць пра тое, што перажыў наш народ...

...Кашкурэвіч мог бы сказаць пра сябе словамі Маякоўскага: "За всех расплачусь, за всех расплачусь". Праз сваю творчасць мастак змог унесці высокую маральную плату свайго таленту ў скрыжалі беларускага мастацтва і, вобразна кажучы, праліць не адну слязу па Радзіме — нашай Беларусі, якая за многія стагоддзі зведала столькі ўсялякіх пакут. Ці не пра тое сведчаць аркушы мастака: "Генацыд", "Напалм", творы з серыі "Блакада"? А колькі яшчэ работ майстра прымушаюць думаць пра спрадвечнае, пра тое, што носім заўсёды ў душы: цыкл "Прысвячэнне Васілю Быкаву", дзівоснае афармленне ўнікальнай кнігі XX стагоддзя "Я з вогненнай вёскі..." Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка, ілюстрацыі да кніг беларускіх пісьменнікаў-франтавікоў, да "Ладдзі Роспачы" Уладзіміра Караткевіча, да "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага...

А побач — бліскучая "Купаліяна". Хіба можна забыць раннія работы гэтага цыкла — маленькія ілюстрацыі да купалаўскіх "Трох паэм" з дзівоснай супервокладкай? З імі я ўпершыню пазнаёміўся ў сярэдзіне 1960-х. Менавіта тады сустрэўся і з самім аўтарам, пра якога шмат разоў пісаў у сваіх нарысах у часопісах і газетах. І так склаўся лёс, што шмат гадоў мы былі суседзямі па лесвічнай пляцоўцы на 5-м паверсе дома на вуліцы Сурганава, 42. А на мансардзе гэтага ж першага пад'езда была яго майстэрня. І амаль кожнай раніцай, выходзячы са сваіх кватэр, мы на пляцоўцы віталі адзін аднаго: я ішоў на працу ў рэдакцыю, ён падымаўся на ліфце ў сваю майстэрню на 9-ты паверх...

"Пацалунак Іуды".



"Гісторыя Фаўста".

Арлен Міхайлавіч для мяне да канца яго жыцця стаў прыкладам рэдкага ўнікальнага мастака і чалавека з чыстым сумленнем, у якога ўсё творчае жыццё было адно-адзінае крэда: "Творчасць для мяне — не сузіранне, а барацьба: праз пакуты — да радасці, як казаў Бетховен..." І далей: "... Шляхі развіцця мастацтва прадбачыць немагчыма — яно развіваецца само па сабе, па сваіх унутраных законах, незалежна ад нашых патрабаванняў і жаданняў. Думаю, што кожны творца павінен несці сваю дадзеную прыродай ці Богам місію і працаваць сумленна. Асабіста мне важна разабрацца ў самім сабе ў гэтым мітуслівым няпростым свеце. Мяне цікавіць стан уласнай душы. Але часта так атрымліваецца, што малюеш нешта вельмі асабістае, а за гэтым паўстаюць вечныя тэмы..."

Так, "вечныя тэмы" Кашкурэвіча — бадай, у кожнай серыі яго твораў, асабліва — звязаных з вечнымі пошукамі ісціны, нават у тых аркушах, якія праз таленавіта схаваныя "таемныя" метафары расказваюць пра, здавалася б, самыя простыя "рэчы": пра "мілае гарадское жыццё" (які дзіўны аркуш "Стары музыкант і яго сабака"!), пра майстроў-шкловыдзімальшчыкаў і музыкантаў Concerto grosso, пра начны Мінск ды дажджлівы лістапад і гэтак далей. А сімвалічны афортны трыпціх "Вузлы" — хіба ён не пра нас?

А пра ілюстрацыі да гётэўскага "Фаўста" я і не кажу. Хаця якія ж гэта ілюстрацыі? Гэта штосьці большае! Аўра гэтых аркушаў, асаблівасці пластычнай структуры, трансфармацыя іх успрыняцця ў гістарычным часе — усе гэтыя моманты не толькі пановаму выяўляюць знаёмы літаратурны арыгінал, але, галоўнае, існуюць нібыта ў сённяшняй прасторы быцця з яго вечнымі праблемамі. І яго Фаўст, сучасны Фаўст, адказвае на гэтыя нашы няпростыя пытанні: што ёсць ісціна? Што ёсць свабода і рабства? Што ёсць жывая навука і схаластычная ідэалогія? Варыяцыі на тэму "Фаўста" — "Апафеоз вайны", "Прасвятленне", "Сад Марты", "Фаўст на плошчы", "Мефістофель", "Вальпургіева ноч", "Эйфарыён", "Хор вядзьмарак" ды шмат іншых з "Фаўстыяны") — хіба гэта не жахлівыя прыкметы часу? Часу бязвер'я ды сатанінскіх разборак, разбэшчанасці душ і духоўнага жабрацтва?

Ад "Партызан" мастак прыйшоў да графічнага асэнсавання "Новага Запавету" і "Найвышэйшай песні Саламонавай" ды цыкла літаграфій на біблейскія тэмы. "Выпрабаванне Хрыста ў пустыні", "Анёл і пастухі", "Вяртанне блуднага сына" — гэта не толькі знаёмыя кожнаму сюжэты, гэта — аўтарскае асэнсаванне "стану ўласнай душы", спроба разабрацца ў самім сабе, адлюстраваць сябе ў гэтым мітуслівым няпростым свеце.

Дык дзе ж тая канчатковая ісціна, якую ўсё жыццё шукаў Арлен Міхайлавіч? Няўжо ў тых кампазіцыях пад назвай "Апакаліпсіс 1" і "Апакаліпсіс 2", якія ён зрабіў тушшу і гуашшу незадоўга да сваёй смерці? І зноў узгадваю ёмістыя і дакладныя словы яго сябра Уладзіміра Караткевіча: "Арлен Кашкурэвіч — мастак гісторыі і сучаснасці. Рамантык і рэаліст: рамантык — бо беларус, рэаліст — бо чалавек зямлі. А можа, і наадварот. Так альбо інакш, але ўсе мы ў наш хрышчоны бомбамі нялёгкі час, мабыць, звяр'яцелі б, каб не былі і тымі, і другімі".

Сказана даўно, але як па-сучаснаму, ёміста, дакладна гэтыя словы гучаць і сёння! А асабіста для мяне выдатны маэстра разца і высокадухоўны чалавек Арлен Кашкурэвіч заўсёды застанецца вечна маладым беларускім Фаўстам...

Барыс КРЭПАК

"Фаўст і Маргарыта".

"Смага". З серыі "Партызаны".

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 37 / 14 ВЕРАСНЯ 2019 г.
Art-блог 9

Скамечаныя ружы-сэрцы

На сталічнай пляцоўцы Ok16, якая зарэкамендавала сябе як адна з найбольш эксперыментальна маладзёжных, адбылася прэм'ера спектакля з загадкавай назвай "М.". Ён стаўся вынікам леташняй Летняй рэзідэнцыі і працягам праекта Тэатр-майстэрня на Ok16.

Надзея БУНЦЭВІЧ



Кранальны прывід ад Наталлі Бекетавай.

Шмат у чым унікальным з'яўляецца ўжо сам па сабе заварот да творчасці Вальжыны Морт — ураджэнкі Мінска, якая апошнія 13 гадоў жыве і працуе ў Амерыцы, а друкуецца па ўсім свеце. Перакладу яе паэзіі на розныя мовы спрыяе не толькі белы верш, да якога яна звяртаецца, але найперш яркая асацыятыўная вобразнасць яе мыслення, калі кожная дэталь цягне за сабой суцэльную повязь самых разнастайных, часта вельмі нечаканых, то абсурдысцкіх, то раптам праніклівёна лірычных, а больш за ўсё трагічна гістарычных ніцяў-знітаванняў. Пра тое сведчыць і яе псеўданім, які, хочаш ці не, наўпрост вядзе да латыні ці оперна-італьянскаму morte — смерць. Лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў, у нас Вальжына выпусціла два свае зборнікі — "Я тоненькая як твае вейкі" (2005) і "Эпідэмія ружаў" (2017). Апошняя кніга (а менавіта яна і пакладзена ў аснову пастаноўкі, у арыгінале акрэслены як "спектакль / паэзія / інсталяцыя") сёлета выйшла яшчэ і ў перакладзе на ўкраінскую мову, заняўшы пачэснае месца ў пяцёрцы лепшых выданняў Украіны.

Пастаноўчую каманду можна ў поўным сэнсе слова назваць маладзёжнай. Беларускі рэжысёр Мікіта Ільінчык, які пару месяцаў таму скончыў Расійскую акадэмію тэатральнага мастацтва (знакаміты ГИТИС), і нядаўняя выпускніца нашай Акадэміі мастацтваў, тэатразнаўца, кіраўнік праектаў Цэнтра беларускай драматургіі Настасся Васілевіч, якая выступіла ў гэтым спектаклі куратарам, правялі папраўдзе невергодную працу з паэтычным тэкстам. З асобных, не звязаных у паслядоўны аповед вершаў яны вылучылі радкі-пацеркі і склалі з іх новую нітку караляў — працяглую, непарыўную, з абрысамі сюжэтнага разгору.

Паэтычны горад Вальжыны Морт вырастае вакол Святланы Цімохінай.

Мабыць, менавіта апошняя акалічнасць, найбольш блізкая сярэднестатыстычнаму гледачу, паўплывала на тое, што ў час абмеркавання пасля прагляду ўвага выступоўцаў сканцэнтравалася вакол побытавых рэалій, праблемы бацькоў і дзяцей, узаемапаразумення між пакаленнямі, прадстаўленымі ў спектаклі трыма жаночымі ролямі рознага ўзросту. Пэўна, на тое быў разлік і саміх пастаноўшчыкаў, каб праз знаёмыя рэчы паступова наблізіць публіку да глыбейшага асэнсавання ўбачанага, прыняцця чагосьці больш нязвыклага, эксперыментальнага. На гэта ж аказаўся скіраваны і такі рэжысёрскі прыём, як частыя паўторы адных і тых жа фраз, выразаў, найбольш значных радкоў, якія штораз гучаць пановому, з іншым настроем і семантычным напаўненнем. Кожнае слова быццам узважваецца зноў ды зноў, дэманструецца з розных бакоў, "прыцэньваецца". А вершы нечакана пачынаюць нагадваць японскія хайку (хоку) — нават не столькі сам гэты жанр, колькі адчуванне ад яго: тая ж сэнсавая насычанасць, сцісласць (з-за паўтораў фразы становяцца самадастатковымі, літаральна прэтэндуючы на асобныя творы), тое ж глыбока філасофскае ўспрыняцце, калі за няхітрай пейзажнай замалёўкай хаваецца чарговая размова пра таямніцы жыцця і смерці.

Дэталёвая праца з артыстамі прывяла да ўзнікнення яркіх вобразаў. Прычым не толькі сімвалічных, як гэта закладзена ў паэзіі Вальжыны Морт, але і псіхалагічных, прычым вельмі дакладных. Святлана Цімохіна (Маці), якую гледачы бачаць першай, ледзь уваходзячы ў залу, цудоўна спалучае два гэтыя кірункі. Яе гераіня існуе ў сваім унутраным свеце — перад намі ці то рэальны чалавек, ці то здань. Яна знаходзіць нейкі сшытак (можа, дзённікавыя нататкі-вершы?), гартае яго, губляе асобныя лісты, сярод якіх ёсць рэнтгенаўскі чорны, раскладае іх на падлозе, а потым змінае, быццам ператвараючы ці то ў кветкі (тым больш, што ў тэксце згадваюцца магільныя ружы і півоні), ці то ў такія ж "пакамечаныя" чалавечыя лёсы. І ўся гэта працяглая сольная сцэна разгортваецца на нейкім памежжы свядомасці і падсвядомасці, чым задае верны тон усяму спектаклю.

А колькі трапных псіхалагічных дэталяў ва ўзаемаадносінах Хлопца (Мікалай Верабей) і Дачкі (Кацярына Банькоўская), якія перажываюць першае каханне. Наколькі ўдала знойдзены і перададзены артыстамі найтонкія дэталі, што малююць рознасць жаночай і мужчынскай псіхалогіі! Гэтаму спрыяе і пластычная (а часам і адкрыта танцавальная) лексіка, пастаўленая Сяргеем Паярковым.

Верагодна, усё гэта таксама паўплывала на "сюжэтна-побытавае" ўспрыманне спектакля гледачамі. Разам з тым, лінія сімволікі, метафарычнасці закладзена ўжо ў выбары акцёраў, узрост якіх не адпавядае тром пакаленням: Бабуля аказваецца — бы з царскіх часоў пачатку XX стагоддзя, старшакласніца-Дачка — з сённяшняй рэчаіснасці, а Маці памятае савецкі ўціск 1930-х, пасляваеннае разбурэнне. Самай маладой па ўзросце аказваецца прывід Бабулі (кранальная Наталля Бекетава з чысцюткай каларатурай у голасе) — і не таму, што, маўляў, тая магла рана памерці. Яе фігура, як і іншых прадстаўніц той ці іншай эпохі, узрастае да абагульненага сімвала эпохі: аўтарам важна падкрэсліць знакавыя кропкі развіцця не столькі адной сям'і, колькі ўсяго беларускага народа.

Гэтаму спрыяе сцэнаграфічнае вырашэнне. Мастак Аляксандр Адамаў, вядомы хіба па сваёй выставе незвычайных "аб'ёмных" відарысаў з выкарыстаннем прыродных матэрыялаў, стварае некалькі невялічкіх асобных пляцовак-інсталяцый, змешчаных лінеарна, адна за адной. Злева ад гледачоў — прыродны "квадрацік", паросты натуральным засохлым быллём. Ён суседнічае з тым, што выкладзены белай пліткай са штучна інфернальным асвятленнем. Па цэнтры — старамодны інтэр'ер былых дзесяцігоддзяў, дзе кожная дэталь цягне за сабой асацыяцыі-намёкі. Справа — дзве "пясочніцы" з натуральным грунтам. Адна — быццам дзіцячая, але з жырандоляй уверсе. Другая — зацягнутая парасткамі. Бо гэта насамрэч магіла, якую прыбірае Маці і адначасова размаўляе з Бабуляй-прывідам, вымушаючы гледача пераносіцца вачыма праз усе пляцоўкі, ахопліваць іх разам і складаць у адзіную повязь часоў. А склаўшы, перагледзець спектакль яшчэ раз. Дарэчы, наступны паказ — 17 верасня.

"Школьныя" сустрэчы тэатралаў

IX Міжнародны форум тэатральнага мастацтва "ТЭАРТ" ладзіцца пад слоганам "Канцэнтрат". Заснавальнікі спадзяюцца на засяроджанне гледацкай цікаўнасці, на пільную ўвагу крытыкаў, на шчыльнае ўзаемадзеянне паміж гледачом, тэатрам і арганізатарамі. "Стварэнне гэтага дыялогу — нашая мэта на працягу амаль дзесяцігоддзя працы", — падкрэсліла дырэктар форуму Анжаліка Крашэўская.

Настасся ПАНКРАТАВА

Тэатральнае свята распачнецца з... оперы. 20-га верасня ў прасторы Ok16 рэжысёр Юра Дзізвакоў пакажа сюррыялістычны спектакль у трох частках, праз які распавядзе сучасны міф пра стварэнне свету тэатра. Пастаноўшчык упэўнены: тэатр узнікае з поўнай свабоды, з кропкі абсалюта, у якой выпрацоўваецца паток свабоднай энергіі. Пасля ажно да 8-га кастрычніка глядач зможа на шасці сталічных пляцоўках далучыцца да 20 пастановак розных жанраў.

Акрамя айчыннай праграмы Belarus open і чатырох замежных спектакляў зладжана прыкметная платформа "Школа "ТЭАРТа". Як зазначыў куратар праекта Аляксандр Марчанка, у яе рамках пройдзе пяць мерапрыемстваў, аб'ядналых лозунгам. "Канцэнтрат. Персона — рэжысёр".

— Мы прапануем разабрацца, якія функцыі рэжысёраў сёння запатрабаваныя. Мы паспрабуем прапанаваць пастаноўшчыкам магчымасці рассунуць асабістыя межы светапогляду, магчымы, і прафесійныя межы, — тлумачыць спадар Марчанка.

Акрамя лабараторыі швейцарскага рэжысёра Дзіні Майфера, па выніках якой павінен з'явіцца спектакль "Рычард III", на пляцоўцы Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі пройдзе закрыты майстар-клас польскага рэжысёра Войцэха Зямільскага "Як змясціць свет на сцэне. Формы дакументальнага тэатра". Сюды будуць запрошаны толькі тыя, хто зможа пераадолець спецыяльны адбор. Абедзве імпрэзы накіраваны на развіццё ведаў, навыкаў маладых беларускіх рэжысёраў.

"Школьныя" мерапрыемствы ўключаюць спектакль "Дуплет" рэжысёра Канстанціна Абашыдзэ. Драму на аснове тэкстаў Вацлава Гавела і Гаральда Пінтара пакажуць на сцэне РТД. Пасля таго як апусціцца заслона, адбудзецца размова з пастаноўшчыкам, падчас якой можна будзе распытаць, у якіх умовах працуе тэатр у Грузіі, якія тэмы хвалююць калег і якая ў іх роля рэжысёра ў фарміраванні рэпертуару. Распачнецца ж платформа з круглага стала "Ураўненне ўраўнавання", удзел у якім возьмуць Дзмітрый Багаслаўскі, Ігар Казакоў і Аляксандр Янушкевіч.

— Рэжысёры, якія на працягу свайго творчага шляху зарэкамендавалі сябе людзьмі прафесійнымі, жывымі і арыгінальнымі пастаноўшчыкамі. Таму асноўным акцэнтам гэтай размовы стане пытанне, па якой прычыне яны выразышлі сысці са сваіх тэатраў. Разам з аўдыторыяй мы абмяркуем магчымасць самарэалізацыі, умовы працы ў дзяржаўных тэатрах і на альтэрнатыўных пляцоўках, пра асобу рэжысёра ў сучасным тэатральным працэсе, — зазначае куратар праграмы.

Займаюся я справай ад дызайну вельмі далёкай, але заўжды памятаю правіла, засвоенае падчас вучобы — не верыць праектнай задачы, сфармуляванай у невядомых табе варунках. Інакш кажучы, перш чым брацца за работу, трэба вызначыць, каму і навошта яна патрэбна. Бывае, што цвяроза паразважаўшы, дызайнер, калі ў яго хапае мужнасці і прынцыповасці, адмаўляецца марнаваць свой час і чужыя грошы, бо не бачыць у прапанаванай для распрацоўкі ідэі сэнсу і перспектывы. І прапануўвае замоўцу ўласную ідэю. Гэта называецца сацыяльная адказнасць. Пра гэта мне думалася на адкрыцці Трэцяга беларускага трыенале дызайн-графікі ў сталічным Палацы мастацтва.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ / Фота аўтара і Сяргея ЖДАНОВІЧА

Фрагмент экспазіцыі.

Здольная на многае

На вернісаж прыйшлі не толькі ўдзельнікі выставы са сваімі сябрамі, але і шмат тых, хто мае да дызайну хоць нейкае дачыненне. Было шмат выпускнікоў БДТМІ — БДАМ, шмат моладзі — будучых дызайнераў, сённяшніх студэнтаў нашай акадэміі. Мяркую, што многія прыйшлі паглядзець не так на выставу, як адзін на аднаго. Гэтыя прафесійная тусоўка. А ў наступныя дні ў залах Палаца было даволі самотна. З гэтага вынікае, што хоць дызайн-графіка, бадай, самае масавае мастацтва, з якім мы сутыкаемся штодня, у свядомасці грамады ягонае месца на далёкай перыферыі.

Шкада... Бо такія, здавалася б, "несур'ёзныя" рэчы, як знакі-лагатыпы прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў, паштовыя маркі ці тэатральныя афішы, з'яўляюцца чыннікам культурнага іміджу краіны, свайго роду візітоўкай нацыі. Падобныя развагі я чуў неяк і ад аднаго з выкладчыкаў кафедры графічнага дызайну БДАМ. Ён казаў, што Беларусі з яе абмежаванымі матэрыяльнымі рэсурсамі будзе надзвычай цяжка выбіцца ў сусветныя ці рэгіянальныя лідары ў сферы прамысловасці ці навукі, а вось праз эстэтыку, праз мастацтва, тым больш мастацтва, разлічанае на масавае ўспрыманне, мы, калі ўключым галаву, здольныя дамагчыся годнага месца сярод краін і народаў. Каб нас ведалі ў свеце, трэба сярод іншага развіваць уласную школу дызайну. У тым ліку і дызайну графічнага.

Сёння наш графічны дызайн не можа прэтэндаваць на лідарства хаця б на еўрапейскім узроўні. Нам да гэтага пакуль далёка. Але ў гэтай галіне ёсць творцы з выразным почыркам, здольныя канкураваць з замежнымі мэтрамі. І тое ёсць добры задзел на перспектыву.

А ўвогуле я параўнаў бы гэту выставу з традыцыйным Восеньскім салонам "Белгазпрамбанка". Замежныя эксперты, прыцягнутыя да працы ў культурніцкай акцыі, звыкла адзначаюць тую акалічнасць, што маладыя беларускія мастакі добра засвоілі міжнародную выяўленчую мову, што іх прынялі б як сваіх у культурных цэнтрах Еўропы. Такія развагі, безумоўна, лашчаць слых, але мушу адзначыць, што нацыянальнае аблічча маладых пры гэтым не надта ўцямнае. Вось і на Трыенале дызайн-графікі мы бачым, што мастакі па-майстэрску валодаюць сучасным інструментарыем, маюць уяўленне пра брэнды і трэнды сусветнай масавай культуры, але Беларусь не з'яўляецца для іх магістральнай тэмай творчасці. Яны збольшага толькі намацваюць шлях да беларускага кантэнту. Экспазіцыя складаецца з плакатаў і ўзораў каліграфіі. Кажучы шчыра, я не ўпэўнены, што каліграфію ўвогуле можна лічыць дызайнам. Гэта спецыфічны від мастацтва, дзе творчая самарэалізацыя не абапіраецца на трывалы канцэптуальны грунт, без чаго дызайну як такога ўвогуле няма. Каліграфія — гэта натхненне ў чыстым выглядзе. Дадам, з непрадказальным вынікам. Тое зноў жа дызайну неўласціва: дызайнер выходна ведае "што", "навошта", "для каго". Але я з задавальненнем узіраўся ў работы Паўла Семчанкі, Генадзя Мацура, Уладзіміра Васюка. Хай гэта і "чыстае мастацтва", але майстэрства згаданых творцаў проста заварожвае.

Не пройдзе глядач міма работ Сяргея Саркісава і Юрыя Тарэева. Яны цудоўна працуюць з фактурамі, кампазіцыйна скіроўваюць увагу гледача на галоўнае, сутнаснае. Абодвум мастакам уласцівa метафарычнасць мыслення.

З агульнай танальнасці выставы вылучаюцца работы Вівлеты Дубоўскай і Марыі Лазарчук. Першая закранула тэму палітычных рэпрэсій 1937 года. Праўда, яе плакатная графіка, на маю думку, занадта прыгожая, нават вытанчаная для такой трагічнай тэмы — форма не зусім адпавядае зместу. Другая засяродзілася на пошуку нязвыклых, па магчымасці крэатыўных, форм прэзентацыі беларускай культуры. Мне падалося, што арыентуецца спадарыня Марыя на людзей, ад тэатай культуры вельмі далёкіх, якіх, на жаль, процьма. Каб прымусіць іх зацікавіцца роднымі каранямі, трэба сапраўды знайсці эфектны ход. У дадзеным выпадку скарыстоўваецца стылістыка Алены Кіш. Яе творчасць ужо стала нашым нацыянальным брэндам, і кожны адукаваны чалавек пра яе хоць штосьці, ды чуў, і, мажліва, бачыў рэпрадукцыі ейных работ.

Работы Юрыя Тарэева, Уладзіміра Цэслера, Аксаны Навасёлавай і Сяргея Саркісава.

На выставе.

Здзівіў мяне на гэтай выставе Уладзімір Цэслер. Творчасць спадара Уладзіміра — гэта, на думку многіх, самае высокае дасягненне нашага графічнага дызайну. Шэраг ягоных плакатаў — шэдэўры. Але апошнім часам яго калі-нікалі вядзе і падводзіць прыродная схільнасць да інтэлектуальных правакацый. Узоры такога, на маю думку, не надта карэктныя мастацтва шанаванага мэтра ёсць у экспазіцыі Трыенале.

Я не ведаю, як фарміравалася экспазіцыя, але ў ёй незразумела чаму адсутнічаюць работы нядаўняга часу, якія ўжо атрымалі высокую ацэнку і прафесіяналаў, і шырокай грамады. Я маю на ўвазе найперш эстэтычную аздобу Другіх Еўрапейскіх гульняў, увесь комплекс распрацовак дызайн-графікі, датычных гэтай падзеі — эмблема Гульняў, піктаграмы відаў спорту, розныя выявы Лёсіка — талісмана спартыўнага свята. Такая буйнамаштабная работа ладзілася ў Беларусі ўпершыню, і яе варта было паказаць грамадзе, кампактна размясціўшы ў выставачнай экспазіцыі. А год таму шырока і розгласна было адзначана стагоддзе і абвяшчэнне БНР. І тут дызайнеры-графікі папрацавалі выдатна. Гэта якраз тыя праекты, дзе зразумела, што рабіў дызайнер, для каго рабіў, і навошта рабіў. Менавіта такія праекты працуюць на станоўчы імідж Беларусі за мяжой і выконваюць важную сацыяльную функцыю ўнутры краіны. Гэта тое, што яднае грамаду. Варта помніць, што дызайн мае і сацыяльную функцыю.

Дакументалістыка — у кінафокусе

Сёння, 14 верасня, у Санкт-Пецярбургу бярэ старт адзін з адметных кінафорумаў у Еўропе — Міжнародны кінафестываль дакументальных, кароткаметражных іграв ых і анімацыйных фільмаў "Пасланне да чалавека". Сёлета яго праграма ўключае больш за 300 стужак, а ганаровымі гасцямі стануць нямецкі акцёр Удо Кір, японскі рэжысёр Кадзуо Хара, польская рэжысёрка-аніматарка Ізабэла Плучынска, сусветнавядомая дакументалістка з Фінляндыі Пір'е Хонкасало, нідэрландская актрыса Ёхана Тэр Стэхе ды іншыя кінематаграфісты.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

"Пасланне да чалавека" — фестываль, які ладзіцца ў Санкт-Пецярбургу пачынаючы з 1989 года. Яго фокус — пераважна дакументальнае кіно, бо кінафорум нарадзіўся з дакументальнай секцыі Масквоўскага міжнароднага кінафестываля. У 1994 годзе конкурсная праграма "Пасланне да чалавека" была пашырана: у яе ўвашлі кароткаметражныя іграв ыя і анімацыйныя стужкі. А ўжо з 1999-га кінаагляд трывала збірае вялікую колькасць работ з усяго свету, садзейнічаючы папулярызацыі дакументалістыкі і пераадоленню яе крызіса ў Расіі. Зараз у праграму фэсту ўваходзіць і Нацыянальны конкурс, у якім дэманструюцца дакументальныя карціны маладых рэжысёраў. Прэзідэнтам фестываля з 2010 года з'яўляецца Аляксей Учыцель.

"Дыега Марадона" — паўнаметражны фільм Азіфа Кападзіа з Вялікабрытаніі адкрые оўлетні, 29-ты фестываль, што будзе доўжыцца да наступнай суботы. На працягу тыдня гледачы здолеюць убачыць як дзіюты, так і гучныя "хіты" дакументальнага кіно. Сярод апошніх, напрыклад, "Варда вачыма Аньес" уласна Аньес Варда, "Форман супраць Формана" Гелены Тржэшціжавай, Якуба Гэйна, "У пошуках Евы" Піа Хэленталь, "Што яна сказала: мастацтва Полін Кэйл" Роба Гарвера, "Радзіма — гэта месца ў часе" Томаса Хайзе… Адмысловую праграму іграв ых фільмаў "Кіно Звышрэальнасці" падрыхтаваў кінакрытык Андрэй Плахаў. Таксама ў межах кінафоруму адбудуцца дзве рэтраспектывы: сланнай бельгійска-французскай дакументалісткі Шанталь Акерман і выбітнага японскага рэжысёра Кадзуо Хары. Конкурсы анімацыйных і эксперыментальных стужак — сярод асноўных аглядаў.

Наш аглядальнік запрошаны арганізатарамі прыняць удзел у гэтым прэстыжным кінафоруме ў якасці члена журы FIPRESCI. Пра тое, што там будзе прэзентавана і абмеркавана, чытайце ў наступных нумарах "К".

Восень — час баляў і вяселляў. Час светлага суму па доўгіх сонечных днях. Час адкрыцця новага творчага сезона пасля летніх вакацый-адпачынкаў у артыстаў сцэны і супрацоўнікаў тэлебачання. У работнікаў культуры гэты сезон ніколі не перарываецца, за што ім — і павага двайная… Восенню добра думаецца пра тое, што будучая зіма — усяго толькі перыяд падрыхтоўкі да будучага лета. А першыя, "бабіны", восеньскія тыдні — неабходная перадумова неўтаймоўнага натхнення і радаснага творчага ўздыму. Сённяшнія лісты — яскравы таму доказ.

Яўген РАГІН

Калі ў вачах — восень…

На здымках:
1 Музычны марафон у Полацку.
2 "Ашмянская пяцёрка".
3 Адзіны дзень бяспекі ў Алекшыцах.
4 Кацярыне Дземідовіч з Трасечанят — 99!
5 Арт-урок "Празапас".

Полацкі раённы цэнтр культуры наладзіў свята народнай творчасці ў дзень 1157-годдзя горада. "Полацкі фэст" разгарнуўся на пляцоўцы ля помніка Сімяону Полацкаму. Рэдактар згаданай установы Кацярына Паўловіч піша што ў шасцігадзінным музычным марафоне бралі ўдзел пятнаццаць лепшых вакальна-харавых калектываў горада і раёна. Сярод іх — народныя ансамблі: песні — "Млын" **Ветрынскага** ГДК, вакальны — "Бела чайка" **Азінскага** СДК, хор **Сільніцкага** СДК, народнай песні — "Заманіха" і народная студыя эстраднага майстэрства "Тандэм" **Полацкага** РЦК, фальклору — "Галасы спадчыны" ансамбль песні "Фярцінка" **Багатырскага** СДК, народнай песні — "Галубіца" ЦК "Полацк", народны клуб "Грай, гармонь любімая — Палачанка" **Полацкага** ГПК і іншыя... Аўтэнтычны каларыт святу надавала і Полацкая Гранд-батлейка. Актыўнасць работнікаў культуры гэтага раёна заслугоўвае ўсялякай ухвалы.

Вельмі рэдка даходзяць да нас лісты ад кіраўнікоў сельскіх клубаў. Сёння гэтую завядзёнку рашуча парушае Алена Альшук — загадчыца СК з аграгарадка **Баруны**, што на **Ашмяншчыне**. Спадарыня Алена паведамляе: *"Работнікі нашай установы адправіліся днямі ў вёску* **Трасечанята**, *каб павіншаваць з 99-годдзем Кацярыну Дземідовіч. Кацярыну Аляксандраўну ўсе называюць бабай Касяй. Шмат ёй давялося перажыць на сваім вяку… Спачатку баба Кася расплакалася, а потым заявіла, што будзе спяваць разам з намі. Выконвалі "Пакаціўся туман па даліне", "У церкви стояла карета…" А потым баба Кася папрасіла музыканта Паўла Дыско падыграць, калі яна заспявае прыпеўкі. Радаваліся і родзічы Кацярыны Аляксандраўны. Свята атрымалася не толькі з песнямі, але і з тортам"*. Каб усе нашы навіны былі такімі аптымістычнымі ды цёплымі!

Яшчэ дзве інфармацыі з **Ашмянскага** раёна. Аліна Санюк распавядае пра народны тэатр гульні і забаў "Серпанцін" раённага цэнтра культуры. Тэатр выступіў днямі перад мясцовай дзятвой са спектаклем "Што такое добра? Што такое кепска?" Потым быў арганізаваны танцавальны флэшмоб. Танцаваць прымусілі нават Ябеду-Карабеду.

А Інга Гіз піша пра тое, што 7 верасня стартавала "**Ашмянская** пяцёрка". Гаворка пра самы масавы забег раёна дыстанцыяй у пяць кіламетраў. Але мерапрыемства не абмежавалася толькі бегам. Свята вызначалася маштабнасцю, нават талісман сёлета з'явіўся — бык Ашмянчык. Імя яму выбіралі ўсім горадам, і прапаноў было шмат: Спорцік, Тарапыга, Ярошка, Бягунчык... Але Ашмянчык перамог большасцю галасоў. На старт выйшла каля пяці соцень бегуноў. Культурны бок мерапрыемству забяспечылі самадзейныя артысты горада.

Не менш сур'ёзная нагода для інфармацыі аказалася ў метадыста аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Астравецкай** раённай бібліятэкі Ганны Францкевіч. Справа ў тым, што па выніках сёлетняга рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" названая ўстанова заняла трэцяе месца ў намінацыі "За пошукавую і даследчую работу". Супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу ішлі да перамогі не адзін год: адпраўляліся ў экспедыцыі, занатоўвалі ўспаміны сталых жыхароў, збіралі этнаграфічны матэрыял. У выніку з'явілася база легендаў і паданняў малой радзімы, вясковых летапісаў, даведак пра знакамітых землякоў і гісторыка-культурныя каштоўнасці. Дарэчы, з базай можна пазнаёміцца на сайце бібліятэкі. Краязнаўчыя матэрыялы знайшлі адлюстраванне ў шэрагу метадычных распрацовак, сцэнарыяў, рэкламных буклетаў. Дзевяць легенд, аб'яднаных гідралогіяй раёна, сабраны ў кнігу "Астравеччына ў легендах". Яна выдадзена да 550-годдзя Астраўца.

8 верасня ў **Беларускім** дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшлі гарадская акцыя Памяці і Смутку ды канцэрт-рэквіем. 78 гадоў таму замкнуліся кольца варожай блакады вакол Ленінграда, якая доўжылася 900 дзён і начэй ды забрала жыцці каля двух мільёнаў ленінградцаў. Арганізавалі мерапрыемства праўленні грамадскіх аб'яднанняў "Беларускі саюз блакаднікаў Ленінграда" і "Непаўналетнія ахвяры блакаднага Ленінграда".

Пра знакамітую кнігу Уладзіміра Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі" згадвае мастацкі кіраўнік цэнтра культуры аграгарадка **Бальшавік** і студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аліна Шмат. На жаль, аўтарка свой раён не называе. Застаецца здагадвацца, што гэта ўсё ж Міншчына. Дык вось Аліна Валянцінаўна піша, што ўпершыню твор выйшаў у 1972 годзе на ўкраінскай мове ў Кіеве, на беларускай пабачыў свет — у 1977-м. Пра эсэ Караткевіча напісана шмат, штосьці новае сказаць тут вельмі цяжка. Але не магу не выказаць аўтарцы словы ўдзячнасці, бо менавіта "Зямля пад белымі крыламі" прымусіла многіх задумацца, у якім велічным краі яны нарадзіліся. І чакаю ад Аліны Шмат наступных пісьмаў. На гэты раз — пра дзейнасць цэнтра культуры, пра гурткі і самадзейныя калектывы і, натуральна, пра нестандартныя платныя паслугі.

Дырэктар палаца культуры горада **Ліда** Ірына Тур піша пра рэалізацыю *"комплекснай праграмы "Арт-урок "Празапас". Адзіны Дзень бяспекі перад пачаткам новага творчага і навучальнага года прайшоў пад дэвізам "Веды — сіла!" Музычнымі нумарамі аздобілі прафілактычнае мерапрыемства салісткі гуртка эстрадных спеваў "Мілашкі" і ўзорнай студыі бальнага танца "Феерыя-Дэнс"*.

Інфармацыя на супрацьпажарную тэму прыйшла і з **Бабруйска**. Метадыст сектара па рабоце сярод дзяцей палаца мастацтваў Бабруйска Кацярына Крылова піша пра пазнаваўча-гульнявую праграму "Агонь памылак не даруе". Гаворка ідзе пра экшн-квэст "Вострaў бяспекі", у рамках якога праведзена тэатралізацыя для навучэнцаў сярэдняй школы № 30 і гімназіі № 1.

Чарговая інфармацыя пра адзіны Дзень бяспекі — з **Алекшыцкай** сельскай бібліятэкі (**Бераставіцкі** раён). Бібліятэкар гэтай установы Зоя Хлебнікава паведамляе пра супрацьпажарную дзіцячую гульню з удзелам прадстаўнікоў мясцовага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Нават майстар-клас "Я выклікаю пажарных" прайшоў. Дзецям былі паказаны тэматычныя мульцікі.

Загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Шчучынскай** раённай бібліятэкі імя Цёткі Юлія Міхайлава распавяла: *"1 верасня бібліятэка арганізавала святочную пляцоўку "Кожная зямля мае тых, хто яе праслаўляе". Гараджанам і гасцям Шчучына былі прапанаваны тэатральныя нумары па творах Цёткі "Сіраціка" ды "Асот і крапіва". Можна было наведаць з віртуальнымі экскурсіямі літаратурна-мемарыяльны музей Алаізы Пашкевіч і клуб-музей Чэслава Немэна, паслухаць лепшыя канцэрты сусветна вядомага музыканта, 80-гадовы юбілей якога сёлета адзначаецца. Цягам дня дзейнічаў майстар-клас "Зробім кніжку сваімі рукамі". На выставах экспанаваліся кружэлкі Немэна і кнігі пра яго на беларускай, польскай і рускай мовах, сучасныя фотаздымкі фальварка Пеішчын, дзе нарадзілася Цётка, сапраўдныя рэчы з дома Пашкевічаў. Малым чытачам прапаноўваўся збор кніг, напісаных нашымі землякамі, — "Чытанкі для дзяцей"*.

Студыя "Цэнтр спадчыны" распавядае пра Свята творчасці "Мінулае, сучаснае і будучае **Гродзеншчыны**", якое адбылося 12 верасня. Аматарскае аб'яднанне народных майстроў і мастакоў "Гарадзенскі каларыт" прапанавала выставу-кірмаш. Сувеніры можна было набыць па любым гусце. Паслугі прапаноўваў майстар-клас па беларускіх танцах. Сваю творчасць прэзентавалі і прадстаўнікі аддзела дзённага знаходжання пажылых грамадзян цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна горада Гродна.

15 верасня — Дзень бібліятэк. "К" шчыра віншуе беларускіх бібліятэкараў са святам!

К

Наша “Клякса”, ды не промах

Пра творчы і гаспадарчы бок сваёй справы распавядае дырэктар Палаца культуры МТЗ Уладзімір КІРУТА

Фота Яўгена РАГІНА

Мы даволі рэдка пішам пра такія буйныя ўстановы культуры, як Палац культуры на сталічнай вуліцы Даўгабродскай. А шкада. У мясцовых супрацоўнікаў ёсць чаму павучыцца. Пра маштабы дзейнасці і сур’ёзнасць намераў сведчыць той факт, што ПК — філіял Мінскага трактарнага завода. Я буду спакойны за лёс беларускай вёскі, калі сельскія клубы стануць творчымі філіяламі мясцовых сельскагаспадарчых арганізацый.

Яўген РАГІН

— Уладзімір Іванавіч, вы ж, напэўна, у дзяцінстве не марылі стаць кіраўніком Палаца культуры, бо наша пакаленне ўсё больш у касманаўты рвалася?

— Ці ў міліцыянеры...

— Сяргей Міхалкоў са сваім “Дзядзькам Сцёпам” пастараўся?

— Безумоўна! Але на мяне ў не меншай ступені паўплывала мая вялікая вясковая сям’я — пяць дзяцей, я — самы меншы. Збіраліся разам, спявалі песні. Потым тата купіў гармонік Маладзечанскай фабрыкі. Старэйшы брат пачаў іграць, я за ім пацягнуўся. Праз час тата павёў мяне ў Слуцкую музычную школу. Не памятаю, каб гэта была мая ініцыятыва, але хто запярэчыць волі бацькоў? Так у жыццё ўвайшло сальфеджыа. Потым з лёгкасцю паступіў у Мінскае культасветвучылішча.

— Пад уплыў біталоў у 1970-х трапілі?

— Натуральна, музыка іх паўплывала істотна. Але ні біт-нікам, ні хіпі не стаў. Тут справа вось у чым. Матэрыяльнай дапамогі ад сям’і чакаць не даводзілася. Вельмі рана зразумеў, што разлічваць трэба на асабістыя сілы. Так што біталы падштурхнулі з першага курса стварыць вакальна-інструментальны ансамбль, з якім і пачалі выступаць на вяселлях. Супер-зоркамі сябе лічылі. Падпрацоўваў уніфармістам у цырку. Мяне нават у два нумары бралі, але не пагадзіўся, бо хацеў стаць вялікім дырыжорам ці баяністам. Потым служыў у войску. Паспеў і танкістам пабыць, і пайграць у духавым аркестры. Паступіў у Інстытут культуры. Таксама падпрацоўваў на вяселлях. Нават аўтамабіль купіў на апошнім курсе. Пасля інстытута застаўся працаваць у Мінску, у Доме самадзейнай творчасці Белсаўпрофа. На заводзе Вавілава вёў ВІА і быў выхавальнікам інтэрната. Потым давялося стаць супрацоўнікам дырэкцыі нацыянальных мастацкіх праграм пры Міністэрстве культуры. Стварылі дырэкцыю да 500-годдзя Францыска Скарыны. Быў адміністратарам ансамбля “Бліскавіца” і аркестра Міхаіла Фінберга...

Фестываль гарманістаў.

— Словам, арганізатарскія здольнасці выявіліся рана. Мара стаць дырыжорам у нейкай ступені здзейснілася.

— Ладзіў семінары кіраўнікоў самадзейных калектываў ведамасных устаноў культуры. З верасня 2003 года — на пасадзе дырэктара палаца культуры МТЗ.

— Які вы па ліку дырэктар і колькі гадоў будынку?

— Чацвёрты. А палац узведзены ў 1965 годзе. Чатыры гады таму яго рамантавалі. МТЗ тады святкаваў сваё 70-годдзе. Няма мяжы дасканаласці, але механізмам сцэны, святлом і гукам я задаволены. Дзесяць тысяч квадратных метраў — агульная плошча нашай гаспадаркі. Навучыўся атрымліваць ад яе максімальную карысць.

— Калі згрупаваць вашы функцыянальныя абавязкі, а потым прыярытэты вызначыць, што атрымаецца?

— На першым месцы — развіццё творчых калектываў. Хоць і не харэограф, а аркестрант, усё роўна мне зразумелыя і гэтыя пытанні. У такім выпадку і задачы ставіць лёгка. Калі не хапае сваіх сіл, запрашаем спецыялістаў-практыкаў збоку. Ад Міністэрства культуры былі на фестывалі нацыянальных культур у Аб’яднаных Арабскіх Эміратах з удзелам больш чым трыццаці краін. Запомнілася выступленне расійскіх мажарэтак. Стварылі і ў сябе такі калектыў (яму ўжо тры гады) для штогадовых фестываляў духавых аркестраў. Відовішча проста шыкоўнае... А ўсяго ў нас 26 аматарскіх клубных фармаванняў, восем з якіх — народныя і ўзорныя. Усе яны з поспехам выступаюць у Беларусі і за яе межамі.

— Цяжка сумяшчаць творчасць з гаспадарчай дзейнасцю?

— Я прызвычаіўся і дыскамфорту не адчуваю. Мне вельмі цікава. Дастаць фарбу ці новую апаратуру — таксама мастацтва.

Ансамбль “Ігрыца” выступае на адкрыцці вытворчасці ў беларуска-кітайскім парку “Вялікі камень”.

— А спачатку было страшна?

— Я пэўны час намеснікам дырэктара працаваў. Ведаў усё да драбніц. За Палацам тады шмат сур’ёзных даўгоў было па камунальнай аплаце. А на разліковым рахунку — нуль рублёў. Але генеральны дырэктар МТЗ прызначыў мяне кіраўніком і цягам паўгода ўзяў на сябе аплату нашых даўгоў. Каб іх не было, мы ўшчыльную заняліся б платнымі паслугамі. І цяпер я кожны тыдзень маю інфармацыю па нашым эканамічным стане.

— Перада мной у вас на прыёме быў эканаміст Палаца. Якая сітуацыя з выкананнем камерцыйнага плана?

— Усё нармальна, ідзём упэўнена і з запасам! Гаварылі і пра карэкціроўку штатнага раскладу на пачатку новага творчага сезона. У нас зусім невялікі кампактны штат — 75 чалавек, астатнія працуюць па дагаворах падраду. І вось яшчэ што хачу зазначыць: хоць лета — зболышага і мёртвы сезон (амаль усе ў адпачынку), але некалькі гадоў запар нашы калектывы працуюць на замежных гастролях з максімальнай аддачай і ўлетку.

— Які гурток самы даходны?

— Адказ адназначны. Гэта ўзорная студыя эстэтычнага выхавання “Клякса”, якую наведваюць больш за трыста дзяцей. Танцаваць прыязджаюць школьнікі з усіх куткоў сталіцы: з Уручча, Серабранкі...

— Я быў сведкам, калі ў вашым палацы выступалі ўдзельнікі пастаўскага міжнароднага фэсту “Звіняць цымбалы і гармонік”. Уваход быў платным, мерапрыемства прайшло з аншлагам. Партызанскі раён — раён з канцэртнымі традыцыямі, якія ўсталёўвае ПК МТЗ?

— Тут нельга жыць старымі напрацоўкамі. Любы канцэрт — прыкладанне максімуму сіл. Трэба не абмяжоўвацца рэкламай у сацыяльных сетках, неабходна сесці на тэлефон і ўзняць усе магчымыя знаёмствы, не толькі тэлефанаваць, але і хадзіць — пераконваць, даводзіць, прываблівіць. Тое ж самае і з нашымі буйнымі творчымі праектамі. Пачынаў я некалі з узнаўлення колішніх аглядаў-конкурсаў мастацкай самадзейнасці. Натуральна — платных. Сёння “Спявай, Беларусь” — запатрабаваны конкурс аматараў самадзейнай творчасці сярод работнікаў завода, які ладзіцца ў лютым. Праца з маладымі наведвальнікамі — адзін з нашых прыярытэтаў. Пры палацы дзейнічае камп’ютарны клуб, збіраюцца выпускнікі на рэпетытарскія курсы. Стараемся цягам года ўсю гэтую моладзь агітаваць наведваць і нашы мерапрыемствы. Атрымліваецца.

— Вы, наколькі ведаю, якасна адрозніваецеся ад іншых ведамасных флагманаў культуры сваімі традыцыйнымі творчымі праектамі. Назавіце іх, калі ласка.

— Міжнародны конкурс эстрадных дуэтаў “Песні, якія нас аб’ядноўваюць”, — яго я прыдумаў сам, — збірае выканаўцаў з 10 — 13 краін: Італіі, Індыі, Кітая, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Малдовы, Польшчы, Турцыі, Украіны, Расіі... Міжнародныя фэсты гарманістаў, казацкай песні (яму шэсць гадоў), народнай песні, бальных танцаў, фестываль духавых аркестраў (не толькі з горада артысты збіраюцца, але і з абласцей) — усе гэтыя мерапрыемствы платныя.

— Але ж гасцям трэба даць прытулак, трэба іх накарміць...

— Вось я і кажу, што трэба на тэлефоне сядзець, бо харчаванне і пражыванне самадзейных артыстаў заўжды бяром на сябе. Канешне, усё гэта не проста. Але 550 месцаў у глядзельнай зале — занятыя. Кожны фэст такім чынам — на самаакупнасці.

— Словы “самаакупнасць” і “рэнтабельнасць” не раздражняюць?

— На пачатку, калі цяжка было, раздражнялі. Вельмі часта згадваў тады пра несправядлівасць. Цяпер разумею, што для эканамічнай адаптацыі кожны кіраўнік павінен прайсці праз такое выпрабаванне. І калі чую ад калег стогны, толькі пасміхаюся.

— Я не раз пераконваўся, што падчас любой палацавай імпрэзы ў вядучых — вельмі багаты сцэнарны матэрыял. А ці адчуваеце часам дэфіцыт крэатыву ў сваёй каманды?

— Спецыялісты творчай групы (пяць чалавек) і падбіраліся такім чынам, каб дэфіцыту ідэй не адчуваць.

— За ўдалыя ідэі даплачваеце?

— Даплачваю штомесяц за актыўнасць пры максімальнай нагрузцы. Гэта 20 — 30 працэнтаў да акладу.

— У цырку нельга сядзець спінай да манежа. У вашага Палаца ёсць традыцыі, легенды?

— Трэба іх прыдумаць тэрмінова.

— На малой радзіме часта бываеце? Як там з культурай?

— Вёска Леткаўшчына на Случчыне літаральна магнітам мяне цягне. Стараюся быць там максімальна часта. Нават баян свой захоўваю ў бацькоўскай хаце, за якой без мяне даглядаюць суседзі.

— Клуб захаваўся?

— На жаль, хоць паселішча і не малое, але клуб не захаваўся. Разам з тым я яго цудоўна памятаю, бо бавіў там увесь вольны час, на баяне іграў.

— Варта чарговы канцэртны праект Палаца рэалізаваць у роднай Леткаўшчыне.

— Абавязкова! Тэматыка — 75-годдзе Вялікай Перамогі. Да слова, бацька мой — быў сур’ёзна паранены пад Кёнігсбергам. Карацей, тэма для мяне — вельмі сур’ёзная.

— Пра што яшчэ марыце?

— Тэма Вялікай Айчыннай павінна прагучаць сёлета не толькі з нашай сцэны. Мяркуем выехаць і за межы кальцавой.

— У якасці артыста выступаеце з баянам?

— Апошні раз гэта было гадоў дваццаць таму. А вось у вёсцы спрабую ажывіць вечарынкі.

— Вы, я гляджу, чалавек радасны.

— Калі побач — спрактыкаваныя калегі, толькі радавацца і застаецца. Моладзь радуе. Надзвычай амбіцыёзныя кадры з канкрэтнымі жыццёвымі і творчымі мэтамі! Наш агульны імідж гэта падвышае значна. І ўвогуле, людзі адчулі дэфіцыт зносін, і мы тут сваёй творчасцю павінны дапамагчы кожнаму. Вельмі радасны абавязак.

> *“На пачатку, калі цяжка было, слова “самаакупнасць” і “рэнтабельнасць” раздражнялі. Вельмі часта згадваў тады пра несправядлівасць. Цяпер разумею, што для эканамічнай адаптацыі кожны кіраўнік павінен прайсці праз выпрабаванне платных паслуг. І калі чую ад калег стогны, толькі пасміхаюся.*

У хэдлайнеры б пайшоў, няхай мяне навучаць...

Глядзеў я тут надоечы па інтэрнэце фрагмент выступу Макса Каржа на мінскім стадыёне "Дынама" і прыкрасць мяне брала: чаму аднаму 35 тысяч аўдыторыі, а другому ў лепшым выпадку ў коле сяброў хрыпець "Не было Галілея і Боба Марлея, не было Сальвадора Далі. Ні Леніна, ні Ленана, ні Карла Лінея, а кіты, чарапахі былі"? Несправядліва? Несправядліва! У мяне таксама голас ёсць, я таксама спяваць хачу! Якія мае гады?! І ўжо зусім было я сабраўся ашчаслівіць грамадства сваім мастацтвам — таленавіты, харызматычны, асабіста знаёмы з Анатолем Іванавічам Ярмоленкам чалавек, вядома ж, толькі новай апорай і выклікам стане як мінімум у айчынным шоу-бізнесе, але ўсё-ткі спачатку вырашыў параіцца з таварышамі, крыху больш дасведчанымі ў музычнай індустрыі, чым я. А раптам там такія падводныя камяні, такое другое дно, што нават мне з маім дарам асталявацца ў ёй будзе немагчыма?
А калі сур'ёзна, сённяшнія мае рэспандэнты раскажуць вам пра тое, наколькі музыканту-пачаткоўцу ў наш час складана / лёгка прабіцца на сцэну і што чакае яго на гэтым шляху — пачынаючы з вучобы ў прафільнай установе.

Алег КЛІМАЎ /
Фота аўтара

Аляксандр Сапега.

Ксенія Шчарбіна.

Леанід Шырын.

Аляксандр САПЕГА,
старшы выкладчык кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, ударнік гурта Apple Tea:

— Выглядае, вядома, дзіўна, але я не ўваходжу ў склад прыёмнай камісіі нават тады, калі ва ўніверсітэт імкнуцца паступіць людзі, што жадаюць атрымаць прафесійную адукацыю па маім профілі — як выканаўцы на ўдарнай устаноўцы. Можа, з-за таго, што выпускнікі каледжаў у асноўным ідуць не на нашу кафедру, а на кафедру мастацтва эстрады — да Аляксандра Старажука. Тым не менш, у "латарэі" мне вязе: за ўсе гады свайго выкладання працэнтамі сямюдзесяцю абітурыентаў я застаўся задаволены. З галавой у іх усё было ў парадку, рукі — пастаўленыя, яны проста не ведалі спецыфіку канкрэтна ўдарнай устаноўкі. Іх вучылі ігры на вялікім барабане, талерках і гэтак далей, але не на ўстаноўцы. А менавіта яна зараз самая галоўная сярод перкусій у любым аркестры.

Цяперашняе пакаленне музыкантаў — шчасліўчыкі. Яны аперуюць велізарнымі масівамі прафесійнай інфармацыі, якой мы былі пазбаўленыя. Дзе таму, хто разам са мной пачынаў у канцы 1970-х, можна было штосьці даведацца аб сучаснай сусветнай музыцы, навучыцца нечаму актуальнаму для тых гадоў? Ды практычна нідзе. Мы "здымалі" з замежных пласцінак, якія цудам траплялі ў СССР, з магнітафонных запісаў, капіявалі з іх ігру — вось у чым заключалася дадатковая адукацыя. Зараз поўна і прыватных школ, і якога заўгодна відэа ў інтэрнэце, толькі паспявай самаўдасканальвацца. З іншага боку, маладым людзям хочацца ж стаць знакамітымі ў максімальна кароткія тэрміны, таму часцяком веды, якімі яны валодаюць, занадта павярхоўныя. І такое хуткае ахопліванне ўсяго і ўся ў маім выпадку часцяком небяспечна: не рэдкасць, калі да мяне прыходзяць навучэнцы са скрыўленымі рукамі, ужо хворымі суставамі. Нават даводзіцца адпраўляць іх у паліклінікі, а потым ужо прыступаць да заняткаў.

Лепшыя ж мае вучні — сапраўды ўпартыя. І інтэрнэт паглядзяць, і кніжкі разумныя шануюць, і з аднагодкамі-калегамі пагавораць, і рады ў старэйшых спытаюць, і на заняткі ў ВНУ прыйдуць. Для іх і для таленту яшчэ малавядомых, уласна, і быў мною прыдуманы фестываль "Барабанны біт" — конкурс маладых барабаншчыкаў. Узровень яго, па меншай меры, прызёраў звычайна вельмі высокі. І ўсіх удзельнікаў фэсту, і, вядома, сваіх студэнтаў я перасцерагаю ад аднаго: не спакушайцеся зорнаму ўзлёту, калі ён адбудзецца ў вашай кар'еры. Неаднаразова назіраў, як у музыкантаў "зрывала дах", і яны пераставалі працаваць над сабой, задавальняючыся дасягнутым. І сёння я ведаю такіх, цудоўна стартаваўшых, што вядуць уласныя школы на "ютубе" і вучаць наведвальнікаў грувам з кампазіцый... Цімы Беларускіх. Гэта значыць, чапляюць сябе да яго папулярнасці, атрымліваючы "лайкі" і новых падпісчыкаў. Усё, далей аб самарэалізацыі можна забыцца, застацца ў "топе" за кошт іншых — вось іх задача. Смешна? Горка. А сярод тых сваіх выхаванцаў, якімі я безумоўна ганаруся, — Дзмітрый Габрусеў, Ілля Сцяпанаў (яны наведвалі мой факультатыў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі), Аляксандр Шэлег, Дзмітрый Белы, Андрэй Чарнавокі, Аляксей Земляны, Мікалай Халадзінскі. Думаю, добрыя перспектывы ў Ксеніі Шчарбіны. Зараз мы з ёй грунтоўна заняліся джазам, свінгам, бачу, што ёй гэта не цяжка і яна атрымлівае задавальненне ад музыкі.

Ксенія ШЧАРБІНА,
студэнтка другога курса кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— У музычнай школе я спачатку вучылася на аддзяленні фартэпіяна, а скончыла яе па класе віяланчэлі. Але звязваць жыццё з сімфанічным альбо з камерным аркестрам не захацела. А гуртоў кшталту фінскай Apocalyptica, дзе з пяці музыкантаў трое граюць на віяланчэлях, у нашай краіне няма. Авалодаўшы ж ударнымі інструментамі, чалавек можа выбраць калектыў любога кірунку, у першую чаргу, натуральна, той, што яму па душы. Як кажа нам, сваім вучням, Аляксандр Мікалаевіч Сапега, без хлеба мы ніколі не застанемся: перкусіяністы заўсёды і ўсюды запатрабаваныя, няхай гэта будзе выканаўца на ўдарнай устаноўцы, асобна на барабанах, марымбе або ксілафоне. У іх пастаянна маюць патрэбу і вялікія склады, што працуюць у самых розных жанрах — ад класікі да народнай музыкі, і аматарскія бэнды, якія спецыялізуюцца, да прыкладу, на кавер-праграмах. Аднак я абсалютна перакананая: не маючы прафесійнай базы, чалавек наўрад ці патрапіць у калектыў або гурт, што па-сапраўднаму адбыліся, ды ставяць перад сабой сур'ёзныя мэты. А ўсе тыя барабаншчыкі, якія ладзяць сёння "шоу", дапусцім, у Мінску на вуліцы Зыбіцкай, праз год — два знікнуць і на змену ім прыйдуць іншыя — такія ж аднадзёнкі. Я ж у будучыні планую ўладкавацца ў ансамбль, які іграе энергічны рэпертуар, па стылістыцы бліжэй да альтэрнатыўнага рока, хоць і фолькавыя каманды мне таксама цікавыя.

Леанід ШЫРЫН,
мастацкі кіраўнік прадзюсарскага цэнтра "Спамаш", кампазітар:

— Пачынаючыя спевакі і спявачкі трапляюць да мяне трыма шляхамі: яны самі звяртаюцца ў наш цэнтр; калі бываю на самых розных мерапрыемствах, я там магу прыкмеціць, на мой погляд, перспектыўнага выканаўцу, і прапанаваць яму супрацоўніцтва; калі мяне "чапляе" дагэтуль невядомы чалавек, які небанальна пераспяваў песню... Леаніда Шырына. Наогул, рынак маладых артыстаў у нас невялікі, таму я ведаю іх практычна ўсіх. А з тым, каго не ведаю, рана ці позна сутыкнуся, паспрабуй ён выйсці на вялікую сцэну.

Задачы абавязкова зрабіць са сваіх падапечных зорак перада мной не стаіць. Хутчэй, захапляе сам працэс — партнёрскі і ўзаемаўзбагачальны. Я прапаную ўласны шматгадовы вопыт, навыкі; вучні дзеляцца сваім бачаннем і музыкі, і нават нейкіх жыццёвых сітуацый. Але, вядома, спрабую развіць у іх усе тыя дадзеныя, маючы якія, ды ўдасканальваючы іх, яны могуць дасягнуць пэўных вышынь у песенным мастацтве.

Наяўнасць у тых, хто прыходзіць хоць нейкай музычнай базы для мяне пытанне не прынцыповае. Так, яшчэ гадоў пяць таму наша эстрада была больш прафесійнай у гэтым сэнсе. Аднак ёсць маса прыкладаў таго, як людзі, не маючыя ніякай музычнай падрыхтоўкі, станавіліся мегапапулярнымі, прычым, па праве. Дзякуючы і таленту, і за кошт праведзенай каласальнай працы. Так ці інакш, яны ўсё роўна абасталі тэхнікамі, прыёмамі, якія дазволілі ім творча мацнець. Карацей, выканаўца, што не разбіраецца, дапусцім, у нотнай грамаце, на ўзроўні той жа інтуіцыі здольны дастаткова добра арыентавацца ва ўсялякіх прафесійных прамудрасцях, "лавіць алгарытм".

Мне цікава гэта пакаленне, яго матывацыі, памкненні, што за музычныя трэнды для юных цяпер актуальныя. Я ж павінен быць у курсе, на якой мове ў прафесіі з імі размаўляць, больш за тое, — калі хачу заставацца сучасным аўтарам, то проста абавязаны дасканала разбірацца ў бягучым моманце ў сусветным шоу-бізнесе. Аднак пры ўсёй сваёй як бы "ўсёведнасці" ў музыцы, моладзь цяперашняя беспадстаўна амбіцыйная, — цвёрда перакананая ў тым, што ўжо заўтра стане новым Джасцінам Біберам. Упэўненасць у сабе — штука, натуральна, выдатная, але яна павінна грунтавацца на чымсьці. Некалькі гадоў таму сваіх падапечных, з якімі толькі пачынаў працаваць, я дзяліў на тры катэгорыі: таленавітыя, хай і слаба падрыхтаваныя; вельмі добра падрыхтаваныя і вельмі таленавітыя; і нешта сярэдняе. Зараз апошняя катэгорыя практычна знікла. Альбо — альбо. А дрэнна падрыхтаваных — здольных і не — пераважная большасць. Такіх пра сябе называю "дзеці фэнтэзі", якія начыталіся ўсіх гэтых прыгод і вырашылі, што і ў рэальнасці іх чакаюць выключна казачныя пераўтварэнні: узмах чароўнай палачкай — і да іх прыйшоў поспех. Можа быць. Але праз два — тры гады яго трэба будзе падмацоўваць. А няма чым, бо яны думалі — таго хопіць на ўсё жыццё. І свята скончыцца. Я кажу ім пра тое. Чуюць — адзінкі, астатнія робяць выгляд, што чуюць, лашчачыся ў будучых вясёлкавых аблоках. Хаатычнасць мыслення ў цяперашніх 16 — 25-гадовых проста дзіўная. Засяродзіцца на чымсьці адным для іх — праблема. А музыка — навука дакладная, яна не трывае легкадумнасці. Але я не асуджаю людзей, а спачуваю, як пацярпелым ад Інтэрнэту: расці з ім у галаве — рэч жорсткая і небяспечная.

У мяне сёння больш надзеі на 10 — 12-гадовых, якія выхоўваюцца ў сем'ях, дзе ведаюць цану і працы, і жыццю наогул. Гэта зусім іншыя дзеці — і абсалютна свабодныя, яшчэ "благія", але адначасова вельмі сур'ёзныя і адказныя, яны разумеюць сваім маленькім розумам, што для таго, каб дамагчыся чагосьці сапраўднага, трэба прыкласці масу намаганняў. Ім ужо не да такой ступені да смартфонаў, "лайкаў" і хобітаў. Спадзяюся, праз пяць — шэсць гадоў беларускі шоу-бізнес чакае нядрэннае папаўненне.

К

Вадзім КАЧАН: “Я патрапіў у Верхні горад — і быў зачараваны”

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

— Калі быў час сыходу з прафесіі, адпаведна, ёсць і час вяртання?

— Вярнуўся я ў 2003-м — вялізнай выставай у галерэі Nova. На ёй акурат і была прадстаўленая мантажная фатаграфія. А вось з дакументальнай (менавіта архіўнай) стаў працаваць недзе апошнія гадоў пяць. Актыўна ёй заняўся, пачаў сканіраваць, — і тут мне моцна дапаможа маглі мае вучні — Дзмітрый Завадскі, Андрэй Дубінін. У цэлым, менавіта навучэнцы маёй фотастудыі, (я ж выкладаю апошнія гады), і натхнілі мяне на канчатковае вяртанне — я заўважыў, як маладыя творцы рэагуюць на старыя адбіткі, і “ўзяў на заметку”.

“ПРАВАЛІЎСЯ” Ў МІНУЛАЕ

— Вадзім Аркадзьевіч, як увогуле здарылася, што вы сталі фатаграфаваць Мінск? Вы самі мінчанін?

— Як ні дзіўна, не. Я родам з вёскі Залядынне Брэсцкай вобласці. У 11 гадоў пераехаў у Брэст, а яшчэ праз шэсць гадоў — у Мінск. Мне горад у адрозненне ад вёскі неяк адразу прыйшоўся даспадобы. Прынамсі, менавіта ў Брэсце я і пачаў вучыцца фатаграфіі. Урокі даваў наш кватарант, — памятаю, як я запісваў у сшытак, што ён раіў. Потым была практыка. Дзве стужкі — і я засвоіў тэхнічны працэс. Калі пераехаў ў сталіцу, памятаю, пэўны час яшчэ сумаваў па Брэсце. А потым паступова ўлюбіўся ў Мінск.

— Магчыма, вы памятаеце ў які момант гэта адбылося?

— Так, быў гэта год прыкладна 1975-ты. Мы з маім аднакашнікам пайшлі ў Верхні горад — там у хлопца жыла цётка. Я патрапіў у той квартал — і быў зачараваны. У той час Верхні горад уяўляў з сябе амаль што руіны: дамы былі старыя, развальваліся, але энергетыка цагляных будынкаў, ландшафтных вулачак проста “зашкальвала”. З'явілася адчуванне, што я “правальваюся” ў нейкае глыбокае мінулае. Мне падалося нават, што я абярнуся — і з-за кута выедзе шпацырная каляска з прыгожай паненкай у купэ. Я да гэтай пары ўдзячны Мінску за тую мрою. Так, менавіта тады горад мяне і паланіў.

— І вы пачалі яго фатаграфаваць удзень і ўначы?

— Так, удзень і ўначы. З фотаапаратам, лічы, не расставаўся. Я быў малады — лёгка выходзіў на кантакт з людзьмі. Мог пайсці фатаграфаваць увечары, пазнаёміцца з кампаніяй моладзі, і наздымаць цэлую катушку стужкі. Здымаў шмат чаго — дамы, віды Мінска, святы, спартыўныя спаборніцтвы, але ў асноўным людзей... Горад жа робяць менавіта яго жыхары. Акрамя таго, у 1980-м у мяне з'явіўся дадатковы стымул фатаграфаваць — я стаў сябрам фотаклуба “Вечерний Минск”.

УНІВЕРСІТЭТЫ

— Цікава, тады ж галоўным фотаклубам сталіцы быў “Мінск”, які ладзіў вядомыя выставы “Фотаграфікі”, што гучалі на ўвесь Савецкі Саюз. Чаму вы вырашылі пайсці ў творчае аб'яднанне пры гарадской газеце, а не ў народны “Мінск”?

Фота з праекта Вадзіма Качана “Мінск. Горад і час”.

— Прызнацца, “Фотаграфікі” змянілі мае стаўленне да фатаграфіі. У гэтым плане выставы сталі маім універсітэтам. Да пэўнай пары я ставіўся да свайго захаплення выключна як да магчымасці захаваць на памяць абліччы родных люзей, горада. А на “Фотаграфіцы” я ўбачыў, зразумеў, што фотаздымак можа несці пасланне.

Ды ўсё ж кіраўнікі “Мінска” падаліся мне нейкімі непрыступнымі (усміхаецца). Таму я вырашыў уступіць у фотаклуб газетчыкаў, — яны выглядалі для мяне больш дэмакратычна.

— І як вас прынялі?

— Вельмі прыязна. Калектыў фотаклуба быў невялікі, але ўсе падтрымлівалі адзін аднога, падказвалі. Асноўны касцяк? Андрэй Шчукін, Яўген Залужны, Леанід Ляўшынаў, вядома, старшыня аб'яднання Уладзімір Кагутэнка... Потым я шмат друкаваўся ў сувязі з сяброўствам у “Вечернем Минске”. Была ў нас і свая галерэя. Як пазней высветлілася, яе наведвалі і тыя самыя фатографы суседняга з намі “Мінска”, што мне, на першы погляд, падаліся такімі “зорнымі”.

ЗНАКАВЫ 1987-МЫ

— Вадзім Аркадзьевіч, вы здымалі горад вялікі часовы адрэзак. Якія гады, перыяд як фатографу вам падаюцца найбольш яскравымі, пераломнымі ў гісторыі Мінска?

— Заўважу ўсё ж, што ў маёй скарбонцы пераважна 1980-я. Але калі разважаць пра гэты час, то ён, без сумневу, унікальны. Кожны год тут быў за некалькі. Кожны — змяняў штосьці ў нашай свядомасці. Мне вельмі запомніўся, у прыватнасці, чамусьці 1987-ты. Памятаю, здымаў звычайнае свята горада. Усё, здаецца, было як заўжды. Мастакі малявалі карціны, хтосьці штосьці прадаваў, дзяўчаты выступалі на сцэне са спартыўным шоу — тады ў моду ўвайшла аэробіка... Але атмасфера панавала іншая. Было адчуванне праходжання пэўнага рубікону — усё цяпер будзе інакш. Можа быць, гэта былі рамантычныя такія настроі, спадзяванні, але я дакладна памятаю той момант. Зраблю здагадку, што менавіта ў 1987 годзе ў Мінску і пачалася сапраўдная Перабудова (смяецца).

— Заўважна, што тыя часы для вас асабліва дарагія...

— Дзякуй, вы маеце рацыю, але хачу адзначыць яшчэ вось што. Я разважаў над тым, чаму сучаснікам так цікава разглядаць фатаграфіі той пары. Бо людзі хочуць даведацца, урэшце, што ў той час з імі адбывалася: без перабольшвання, без афіцыйнага “налёту”. Так, як ёсць. І, дзіўная рэч, акурат такая фатаграфія — не заказная, напаўаматарская, і дае магчымасць тое ўбачыць.

Часам мяне нават папракаюць: “Ой, такога не было”. Як жа не было? Я хадзіў па гэтых вуліцах, здымаў гэтых людзей! Я быў больш вольным чалавекам, чым мае калегі-газетчыкі — яны вымушаны былі ўпрыгожваць, выдумляць. А я фатаграфаваў тое, што вабіла маё вока. Потым ужо ішло ўсё астатняе — публікацыі і гаданары. Але галоўнае — было жаданне фатаграфаваць.

— І сёння архіў аддае вам у сто разоў.

— Менавіта так. Аддае, адкрываючыся нават для мяне самога.

МІНСК ЗМЯНЯЕЦЦА

— Вадзім Аркадзьевіч, самы час пагаварыць пра ваш актуальны праект. Як ён нарадзіўся?

— Ідэя простая: Мінск тагачасны і сучасны. Што змянілася, як час уплывае на яго аблічча. Праект нарадзіўся лёгка. Архіўная частка ўжо была, справа была за сучаснай. Напачатку я хадзіў з сучасным фотаапаратам, каб зафіксаваць знаёмыя віды, але штосьці не “вязалася”. Паспрабаваў сфатаграфаваць мабільным — і неяк адразу ўсё стала на свае месцы. Адбылося супастаўленне не толькі візуальнае, але і тэхнічнае.

У праекце я не выношу аніякіх прысудаў. Шчыра імкнуся разабрацца, што змянілася.

— І што змянілася?

— Шмат чаго губляецца, але шмат і ўзнікае. Мне асабліва, вядома, шкада, старых будынкаў у цэнтры горада. Хацелася б, каб была магчымасць іх захаваць. Яшчэ турбуе, што ў тым жа Верхнім горадзе — амаль ніхто не жыве. Так ён гудзіць, віруе ўлетку, а вы наведайце яго зімой: квартал — пусты. А Мінск жыве дзякуючы сваім гараджанам.

Ёсць памылкі, сапраўды, але, з іншага боку, ёсць і жаданне ўдасканальвацца. Я гэта бачу. Разумею, што акурат зараз наш горад становіцца еўрапейскай сталіцай. З памылкамі, са складанымі рашэннямі, але ён шукае сваё аблічча. Горад ідзе насустрач Еўропе. І мяне гэта вельмі цешыць. Нельга ўвесь час заставацца “запаведнікам сацыялізму”.

К

Не сумаваць па страчаным, незваротным...

Да 80-годдзя ўз'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі

Амаль у кожным горадзе, у мястэчку Беларусі, — а ў заходніх абавязкова! — ёсць вуліца "17 верасня". І яны ніколі не будуць перайменаваныя, як, скажам, у Маскве вуліцы "25 кастрычніка", што побач з Краснай плошчай, вярнулі былую назву "Нікольская". Чаму такая ўпэўненасць? А таму, што ў 1921-м па Рыжскай дамове разарваная Беларусь, што амаль 20 гадоў была пад Польшчай, урэшце аб'ядналася, каб ужо назаўсёды стаць адзінай. І таму ў гісторыю краіны ўвайшла светлая дата.
17 верасня 1939 года.

МЫ, ПРЫШЛЫЯ

Усё ў людскіх лёсах выпадкова, нават, па сутнасці, і зачацце кожнага з нас, і з'яўленне на свет.

Не буду ўзгадваць безліч прыкладаў, зірну на выпадковасці ўласнага лёсу. Бацька, які нарадзіўся яшчэ ў царскім Тыфлісе, юнаком апынуўся ў Баку, дзе 20 гадоў займаўся адказнай абарончай працай. У 44-м яго выклікалі ў Маскву. Генерал загадаў:

— Трэба на вызваленых ад фашыстаў тэрыторыях узнімаць абарончую работу. Арлоў, на выбар табе: Вялікія Лукі, Гродна, Белгарад. У калідор — і праз дзесяць хвілін агучыш сваё рашэнне.

Каго тата сустрэў у калідоры? Канешне ж, тых, хто толькі-толькі вызваляў краіну. Яны ж і параілі:

— Белгарад — ушчэнт зруйнаваны. Вялікія Лукі — проста вялікая вёска. Гродна — ацалелы культурны горад з помнікамі сярэднявечча. Арлоў, давай, — толькі Гродна!

Бацька яго і абраў. Так на Вялікдзень 26 красавіка 1946-га я малы апынуўся ў цудоўным горадзе, які лічу сваім родным. Апынуўся ў Беларусі, вядома ж, — выпадкова!

Дзякуй, тата, за выбар!

ГРОДНА, ЯКОГА ЎЖО НЯМА

...Простай чыгункі на Гродна не было, таму ехалі праз Вільню. З Парэчча за вокнамі вагона спрэс пацягнулася тое, што бачыў толькі на ілюстрацыях Васнякова да рускіх народных казак — лес!

Гродна, вакзал, з якога праз дзесяць гадоў пачнецца маё кінематаграфічнае існаванне. Перад ім круглая клумба з бюстам Сталіна. Тут канцавы прыпынак аўтобуса (маркі ГАЗ-03-30), які потым рушыць праз увесь горад, а як адбудуюць узарваны мост, дык і за Нёман, міма тытунёвай фабрыкі да станцыі Ласосна.

Маставыя крыты не звыклым мне бакінскім асфальтам, а — брукаванкай.

Назвы вуліц, нязвыклыя на слых: Рэйманта, Славацкага, Ператца, Жэромскага, Ажэшка ці ўвогуле з прыкметай Сярэднявечча: Замкавая, Цагляная, Піўная, Гарбарская, Мядовая, Грандзіцкая, Віленская (*маё фота 1956 года: Віленскі завулак*).

А вуліца, дзе мы жылі, — Ясная.

Ад вакзала па вуліцы Ажэшка да Пакроўскай царквы — паабапал аднапавярховыя дамкі, быццам каменныя. Але гэта падман, "вынаходніцтва" губернатара-хітравана Тызенгаўза: каменны толькі ўражваючы фасад, а тры астатнія сцяны — драўляныя. Чамусьці ўжо ў нашы часы іх зруйнавалі, хаця мог бы раён стацца своеасаблівым, як у Мінску Траецкае прадмесце. Добра, што пакінулі хоць адзін такі дамок — цяпер як экспанат.

Ад царквы і Дома афіцэраў бугрысты каменны брук маставой змяняўся шчыльна падагнанымі каменнымі брускамі. Невялікая зала Дома афіцэраў доўгі час была адзінай у горадзе канцэртнай пляцоўкай — там я не прапускаў аніводнага гурта гастралёраў.

Далей злева — дом пісьменніцы Элізы Ажэшка, адданы дзецям: Дом піянераў. Там я наведваў гурткі: музычны, авіямадэльны, драматычны — гэты вёў будучы народны артыст БССР Юрый Сідараў, аб чым мы, у новыя часы сутыкаючыся ў Рускім тэатры Мінска, з замілаваннем узгадвалі. Калі пашыралі вуліцу, знакавы дом на колькі метраў ссунулі ўглыб саду. У доме і цяпер з раніцы да вечара чуюцца звонкія дзіцячыя галасы.

За стыльным шэрым бюстам зямлячкі Ажэшка, які невядома як захаваўся падчас акупацыі, месціліся дзіцячыя дамы: жылі там дзеці-безбацькоўшчына, ахвяры вайны. Было сумна глядзець, калі шпацыравалі парамі, усе аднолькава апранутыя, — "як з дзетдома", пайшло з тых часоў параўнанне.

Ля ўваходу ў гарадскі парк (*маё фота 1956 года*) стаяла бочка на колах з незразумелым надпісам "Морс". Аказалася, смачна: нязвычны натуральны сок невядомай мне журавіны. Другі напой таксама называўся нязвыкла: "сітро".

У парку — тыпавая скульптура: Ленін і Сталін побач, як закаханыя, на лавачцы. Пасля "развянчання" культа Сталіна доўга не маглі ўлады вырашыць: як адрэзаць "культ", пакінуўшы Ільіча? Праз колькі гадоў "закаханыя на лавачцы" адной ноччу ціха зніклі, абодва.

Перад паркам плошча, тады Леніна, цяпер Тызенгаўза, на ёй сціплы тыпавы помнік Ільічу. Але калі паглядзець на пастамент правадыра з боку, то на мармуровых брусах выяўляліся дрэнна зцясаныя кручастыя пісьмёны. Дазналіся потым: гэта надмагіллі з габрэйскіх могілак — яны, вялікія па плошчы, раскінуліся непадалёк ад нашага дома. Цяпер там стадыён, — дзікунства, вядома.

На рагу-павароце з Ажэшка на Савецкую доўга яшчэ частаваў гарадзенцаў марожаным сівы чырвонатвары гандляр-прыватнік — "перажытак ўласніцтва". На яго калясцы з лядоўняй наўскос напісана: Lody. Доўгай лыжачкай-паўшар'ем заграбаў тыя "лёды" — рознага колеру і рознага смаку! Стаяў ён ля ўваходу пад шыльдай "ЗАГС". Над уваходам навісаў вялікі балкон з кветкамі, а там часта голасна лаяліся і біліся муж з жонкай — апошняе папярэджанне маладзёнам, што рушылі ў ЗАГС.

Пачыналася вуліца з гатэля і рэстарана, а далей... Далей была ўстанова, якую я наведваў амаль кожны дзень: кінатэатр "Спартак". Ды што "кожны дзень": у зале без вентыляцыі я праседжваў па два — тры сеансы запар, да галаўнога болю.

Там меўся буфет, і калі ў першы дзень паказу новага фільма наладжваўся культпаход радзіны Арловых, тата даваў сербануць піва з гранёнага куфля. Падчас чакання сеанса круцілі песенькі з грамплыт, што ўжо меліся ў нас дома. У зале, найдалей ад экрана, існавалі ложы, адкуль было бачна і чутна найгорш, але — прэстыж!

Савецкіх карцін здымалася няшмат — "Кубанскія казакі", "Кавалер Залатой зоркі", "Клятва", а пасляваенны кінапракат ратавалі стужкі, што пачыналіся надпісам "Гэты фільм узяты ў якасці трафея пасля разгрому Савецкай Арміяй нямецка-фашысцкіх войск пад Берлінам у 1945 годзе". Ні прозвішча акцёраў, ні стваральнікаў, нават назвы былі зменены: дазнайся, якой краіны прадукцыя — трафей і ўсё тут!

Але я хутка стаў "кіназнаўцам": нейкім чынам трапляючы ў кватэры дасведчаных гарадзенскіх пані, я корпаўся ў падпісках даваенных часопісаў Kino і, паступова вывучваючы польскую мову, тлумачыў сябрам прозвішчы акцёраў, сапраўдныя назвы карцін. Зруйнавалі "Спартак", цяпер на яго месцы ГУМ.

На гэтай цэнтральнай, яўна ўжо перайменаванай, Савецкай — крамачкі на ўсіх першых паверхах дамоў: "Кніжны" з калекцыённымі паштовымі маркамі, "Культтавары" з грамплытамі, якія буду часта наведваць.

У скверыку перад рэдакцыяй "Гродненской правды", дзе — пазней дазнаўся — працаваў Васіль Быкаў, усталявалі бюст Сталіна. У 61-м развянчалі культ асобы, і бюст знік. П'едэстал доўгія гады стаяў пусты, хлопцы са смехам узнімалі-ставілі туды сваіх дзяўчат і фатаграфавалі — была такая завядзёнка. Урэшце месца заняў бюст земляка — маршала Сакалоўскага.

Далей па гэтым жа баку стаяў вялікі зруйнаваны белы дом, адзін з нешматлікіх разбураных у вайну. А на тратуары перад ім года да 48-га ляжаў вялікі цяжкі камень з выбітымі арлом са свастыкай. Людзі, мінуючы месца, абавязкова імкнуліся наступіць на яе.

На Савецкай плошчы, кажуць, быў рынак, кірмаш. Між рэшткамі гандлярных радоў ляжалі вялікія скрыні: абсталяванне, станкі для тонкасуконнага камбіната.

Мост праз Нёман узарваны, сувязь з той часткай горада па часовым, наплаўным.

Яго развадзілі, калі ўверх па плыні, ажно да Мастоў, ішлі параходы. Так, у Гародне было параходства, уласная флатылія! На трохкалёсных, падобных, як у фільме "Жорсткі раманс", "статках-лайнерах" мы каталіся: амаль аднатыповыя "Мельнікайтэ" і "Летувайціс", і вялікі карычневы "Пушкін". Уніз па Нёмане яны шлёпалі пліцамі ажно да Балтыкі, пакуль раку пад Каўнасам не перагарадзіла плаціна ГЭС. Палубы заўсёды былі поўныя пасажыраў, пераважна сялян: рушылі звычайна з мэтамі гандлю, з цяжкімі клункамі.

Захаваўся ля чыгуначнага моста будынак былога рачнога вакзала, дзе тады грымела музыка і працаваў буфет.

На Савецкай плошчы — былая Баторыя — чатыры Божых дома. Той, на месцы якога цяпер тэатр, зруйнаваны даўно: на сценах выраслі досыць тоўстыя дрэўцы. Фара Вітаўта, якая перабудоўвалася ў гарнізонны праваслаўны сабор, затым зноў станавілася касцёлам, стала сховішчам спісанай трафейнай і савецкай ваеннай тэхнікі для ДОСААФа (*маё фота 1956 года*). 29 лістапада 1961 сапёры яе ўзарвалі. Цяпер там сквер, але на сцежках чырвоны друз ад дахавай чарапіцы. Два астатніх — Катэдра і Бернардзінскі — сёння аб'екты наведвання і вернікамі, і турыстамі.

Рана-раніцай пачынаўся пераазвон, на слых распазнавалі: о, гэта Фарны касцёл, а гэта званы Пакроўскай царквы — трэба ўставаць. А ўслед завывалі гудкі: о, гэта кожзавод, а гэта гудок мясакамбіната — трэба збірацца ў школу. З нейкага года званы забаранілі і праваслаўным храмам, і каталіцкім касцёлам — час абвяшчала радыё.

■■■

На тыя часы мой горад яшчэ адрозніваўся ад астатніх "саветызаваных" га-

радоў Беларусі. У ім яшчэ дажывалі нясцёртыя рысы правінцыйнай "еўрапейшчыны". Што было адметным?

Канечне, архітэктура былых часоў: велічныя барочныя касцёлы, двухпавярховыя дамы, што тут называлі "віллы", і ў якіх вольна жылі па адной прывеліяванай радзіне на паверсе.

А яшчэ — звычаі, этыкет: нават мае, прыехаўшыя з Каўказа бацькі, звярталіся пачціва да суседзяў "пані Казімежова", "пан Басіньскі" і жартавалі: "пане гувняж" (зала-тар).

Мужчыны, было, насілі на рукавах чорныя павязкі — прыкметы жалобы. Жанчынкі хадзілі на абцасіках, у капялюшыках з вуалеткамі — такія бачыў у амерыканскіх фільмах, — абзывалі мы іх "пані-малёвана".

Нязвычнымі былі імёны паплечнікаў па вулічных гульнях: Ядзя, Стасік, Зося, Зэнек, Фелікс, Рэня. Некаторыя замест гука "л" вымаўлялі "в": масво, бавон, ёвка.

Дзівосны ўтульны тэатр, дзе ложы былі абабітыя чырвоным аксамітам, у які я на спектаклі наведваўся кожную нядзелю.

На скрыжаванні Кірава і Сацыялістычнай гурталася "біржа": тут наймалі пільшчыка дроў з гібістай пілой, абкручанай вакол тулава і счэпленай на жываце ручкамі.

А на поўнач, у бок Грандзічаў, Гожы вялікае поле — прыкладна, дзе цяпер тэлецэнтр, — займалі ўрадок дзясяткі нямецкіх аўтамашын, памятаю адно легкавікі. Мяркую, што ў большасці проста скончылася паліва, іх немцы кінулі, а нашы звезлі сюды — да лепшых часоў.

У рэстаране "Нёман" яшчэ стаяў вялізны, на ўсю сцяну, мастацкі разьбяны буфет-бар (не веру, што яго распілавалі і выкінулі, — нехта вёрткі гэты антыкварыят завёз у загарадны дом). Сюды пасля спектакля збіраліся артысты тэатра, якіх паважаў горад, а сярод іх вылучаўся, заўсёды ўвесь у бе–лых строях, гарадзенец Мікалай Вагнер, ён скончыў у Маскве курс у самога Завадскага — зорка, гонар, брэнд Гродна!

А яшчэ: нясцёртыя прыкметы баёў, сляды нядаўняй вайны.

У канцы нашай вуліцы Яснай ля дома бляявай падружкі Зосі, проста на абрыве над паселішчам Падпярэселка віўся нечый акоп, у якім нечыя ваяры чакалі некага з захаду.

У тым сапраўдным акопе гулялі ў несапраўдную вайну, я — з сапраўдным аўтаматам ППШ: некалі знайшоў у лесе, прынёс дамоў. Бацька агледзеў, упэўніўся, што той без замка, аддаў: гуляй.

Дарэчы, у лесе можна было знайсці кулямётныя ленты, снарады, ля ўвахода ў лес у бок Пышак года да 50-га ляжала вялікая бомба без выбухавічка — выкруцілі мінёры.

Прачынаючыся, першае, што я дзіцём, падлеткам бачыў, — плакат над ложкам. На ім жахлівы дзядзька тоўстым пальцам пагражаў: "Не кранай снарада, які не ўзарваўся!" Лясы Гарадзеншчыны поўныя такіх снарадаў і бомбаў, пацаны разбіралі іх. Тата, які прымаў удзел у разміраванні вобласці, павесіў той плакат і штодзень расказваў пра пытлівых хлопцаў, якія пры разборцы загінулі.

■■■

Перайменоўваліся вуліцы... на іх усё менш паноў у камізэльках і "пані-малёваных" пад вуалеткамі... ужо не чутна завадскіх гудкоў... зніклі гарадскія кірмашы з сеннымі вазамі, дзе ў мяхах павізгвалі парсючкі, а ў корабах крышталікі солі пабляскваліі на брусах сала, выпражаныя коні фыркалі, апусціўшы галовы ў торбы з аўсом: на месцы Грандзіцкага кірмаша — сквер і крамачкі, на месцы Скідзельскага — аўтастанцыя...

Памятаю сюжэт кінахронікі: у Гродна нарадзіўся 100-тысячны жыхар!

Паступова на вачах горад мой стаў змянящца.

ШТУРШКІ ДА ПРЫЗВАННЯ

Хаця па-ранейшаму працавалі піўнушкі, якія спрэс называліся "Блакітны Дунай"; па-ранейшаму ў сем гадзін вечара адключалася ў жылым сектары святло, і недадзеланыя ўрокі прыходзілася заканчваць пры лямпах на керасіне; па-ранейшаму рана-раніцай калаціла ў дзверы малочніца з Падпярэселкі...

І ўсё ж побыт набываў новыя прыкметы, а мы з дзяцінства пераходзілі ў юнацтва.

■■■

Што хлопцам цікавей за ўсё? Канешне ж, машыны!

У Гродна падзея: раптам, недзе напачатку 50-х, з'явіліся адразу сем першых таксі маркі ГАЗ-20. Стаянку іх прызначылі на плошчы Леніна. Школа наша была непадалёк, і мы ў перапынках бегалі глядзець на сем "Побед" бэжавага колеру, нават запомнілі іх парадкавыя нумары! Наш сусед "шафярыў" на адной з "Побед" і часцяком прыязджаў дамоў, кідаючы таксоўку на вуліцы: досыць было часу падзівіцца на айчыннае аўто. Праўда, у горадзе мелася шмат трафейных машын, і мы не маглі не звярнуць увагу на падабенства "Победы" з нямецкім "Опель-капітанам". Неўзабаве ваенны начальнік, які кватараваў на нашай вуліцы, набыў уласную "Победу"! Неяк пракацію нас... Няўжо, марылася, і мы калі-небудзь сядзем за стырно ўласнай машыны?!

Услед другая сенсацыя: тры навіткія — два чырвоных, адзін сіні — вялікія гарадскія аўтобусы маркі ЗІС-155. Абіраць таксі грошай у падлеткаў не ставала, а ўжо на аўтобусах, якія яшчэ пахлі завадской фарбай, накаталіся ўволю.

Незлічоныя бясконцыя прагляды ў кінатэатрах "Спартак", "Чырвоная зорка", у Доме афіцэраў і клубе чыгуначнікаў мелі працяг — у юнака, які ўжо марыў стаць рэжысёрам, засвярбела думка: калі нельга зняць фільм, то можна пачаць з кінапраката!

Заўважце: у цалкам савецкім Гродна з'явіліся першыя ў СССР кінапрадюсары: Юрык Гладкіх і Вова Арлоў, абодвум па 11 гадоў, у абодвух зусім несавецкія захады на ўласнае прадпрымальніцтва! Гродна чамусьці гэтай — тады крымінальнай, а сёння нават ваўтарскай — падзеі не заўважыў.

Адбылося наступнае.

У пасылачную скрыню мы з Юрам урэзалі патрон з электралямпачкай, выпілілі простакутнічак па кінакадрыку, з дроціка сплялі рамачку, у кардонны тубус уціснулі лупу — і праектар быў гатовы! Тут вялікі ўнёсак, лідарства будучага інжынера-ракетчыка.

Набылі тры дыяфільма: "Сіндбад-мораход", "Капітан "Дзіяны" пра марака Галавіна і яшчэ нейкі — на большае не ставала грошай. У цёмнай кладоўцы нашага дома на Яснай абсталявалі кінатэатр "Гродна" — такой назвы ў горадзе не было. Мы малявалі каляровыя афішы і квіткі, якія прадавалі малым па 15 — 20 капеек (за 15 капеек можна патэлефанаваць з вулічнага аўтамата, за 40 набыць паштовую марку). Перад сеансам — музыка: круцілі грамплыты. Кожны фільм дэманстраваўся за асобную плату, пасля чаго з "залы" вытурвалі гледачоў, а пасля набыцця імі новых квіткоў запускалі праз кантралёра наноў.

Было ўсё, як у сапраўдным кіно: мы знарок збівалі наводку, каб даць малым пакрычаць: "Сапожник! Фокус!" Я выразна чытаў непісьменным гледачам подпісы пад кадрыкамі, шмат дадаючы ад сябе пры кожным новым паказе. У таты знайшліся нейкія вучэбныя дыяфільмы па грамадзянскай абароне, мы выкарыстоўвалі іх у якасці кіначасопісаў перад "асноўным" фільмам, прычым, пасля яго ўключалі святло і запускалі спазніўшыхся, якіх, было, знарок не пускалі раней. Улічваючы абмежаваную колькасць і тэматыку вучэбных стужак, я на адных і тых жа выявах сухім дыктарскім голасам нёс нешта, не маючае аніякіх адносінаў да сапраўднага сэнсу. Тут ужо лідарства належала будучаму рэжысёру і сцэнарысту.

Заробленыя грошы ўкладвалі ў вытворчасць: набывалі новыя дыяфільмы. Але ўжо адчувалі: гэта ж мы — багема!

І аднойчы ў краме на рагу вуліц Ажэшка і Сацыялістычнай (*мой здымак 1956 года*) нейкім чынам купілі бутэльку шампанскага. Словам, набывалі якасці незалежных прадюсараў. Прыёмамі Харві Вайнштайна не карысталіся з-за малечага ўзросту.

Памятную краму тую зруйнавалі, пашыраючы вуліцу, а шкада: няма на чым замацаваць мемарыяльную дошчачку — адной прыкметнасцю ў маёй Гародне было б болей.

А неўзабаве, працуючы ўжо ў Мінску на "Беларусьфільме" ў "сапраўдным" кіно, я паўтарыў учынак Джэймса Кэмерона, які ўклаў у свой "Тытанік" грошы ад закладзенай маёмасці: патаемна ад бацькоў прадаў паліто, якое яны мне справілі, і набыў у Гродна, у крыху састарэлых "панімалёваных" гадавыя падшыўкі даваенных польскіх часопісаў Kino, якія далі мне базавую інфармацыю па гісторыі сусветнага кінематографа.

Дзякуй, пані, дзякуй горад дзяцінства і юнацтва.

■■■

Будовы-перабудовы: неўзабаве разбураны мост злучыў абодва берагі, за ім з'явіўся яшчэ адзін мост, потым яшчэ... перанеслі пажарнае дэпо па другі бок каланчы... у дадатак да чатырох школ адкрылася больш дзясятка... раскінуўся азотна-тукавы камбінат... узраслі мікрараёны, якія тубыльцы ўжо й не лічылі Гародняй... даўно забыўся сюжэт кінахронікі пра 100-тысячнага жыхара...

Да заканчэння дзясятага класа ў 56-м я ўжо цалкам быў гатовы "даць нырца" ў жыццёвае мора і самастойна плысці да маяка, святлом якога стаў для мяне прамень кінапраектара.

Той жа вясной рэжысёр Леў Голуб на чале кінаэкспедыцыі пачаў здымаць на гарадзенскім вакзале большую частку фільма "Міколка-паравоз", мяне далучылі да кінагруппы, зазвалі ў Мінск. Сувязь з Гародняй слабела, а пасля зыходу ў нябыт продкаў абарвалася.

Цяпер без супынку мінаю любімы горад: качу міма звярынца, проста па вуліцы "17 верасня" — адразу на могілкі.

Памятныя мясціны Гародні не наведваю, каб не засмучаць светлыя ўспаміны, не сумаваць па страчаным, незваротным. Кіруюся радкамі Шпалікава:

"По несчастью или
к счастью истина проста:
Никогда не возвращайся
в прежние места".

Уладзімір АРЛОЎ,
кінарэжысёр

Здымкі падборкі "Гародня, якой ужо няма" зроблены аўтарам у 1956-м фотаапаратам "Зеніт", набытым на першыя грошы, заробленыя працай на фільме "Міколка-паравоз". Фота ніколі нідзе не друкаваліся.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст."; "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст."; "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст."; "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст."; "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст."; "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Кніжны знак"** — да 15 верасня.
■ Выстава **"Акварэльная элегія"** Фёдара Кісялёва — да 22 верасня.
■ Выстава жывапісных твораў народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі (1933 — 1997) **"Касмічны пілігрым"** — да 20 кастрычніка.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў альбо саломапляценні (на выбар) — кожную нядзелю. Пачатак а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава **"Андрэй Андрэевіч Грамыка — дыпламат савецкай эпохі"** — да 15 верасня.
■ Выстава фатографа Анатоля Дрыбаса **"Мілы сэрцу горад мой"** — да 15 верасня ў галерэі музея.
■ Выстава **"Даўніна і навізна. Рускае ювелірнае мастацтва XVIII стагоддзя"** — да 6 лістапада.
■ Выстава **"Маісей Напельбаум. Партрэт эпохі"** (да 150-годдзя выдатнага фотамайстра родам з Мінска) — да 15 кастрычніка.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ Абноўленая экспазіцыя **"Гісторыя сацыял-дэмакратычнага руху канца XIX — пачатку XX стст."**
■ Інтэрактыўная выстава **"Гульні розуму"** — да 1 снежня 2019-га.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Сучасная гісторыя Рэспублікі Беларусь: 1991 — 2017 гг."**.
■ Выстава **"Грошы нашага часу: жыццё без лішніх нулёў"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"Станіслаў Манюшка: музыка ў душы і вобразах"** — да 22 верасня.
■ Выстава **"Нам засталася спадчына…"** (да 50-годдзя Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры") — да 22 верасня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Беларуская культура праз прызму часоў"** — да 22 верасня.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя беларускага кінематографа"**.
■ Выстава фатаграфій Сяргея Міхаленкі **"Меланхолія"** — да 6 кастрычніка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя серыі карцін Міхаіла Савіцкага **"Лічбы на сэрцы"** — да 26 верасня.
■ Часовая фотадакументальная экспазіцыя **"1939. Пачатак Другой сусветнай вайны"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Дзівы антычных цывілізацый"** — да 15 студзеня.
■ Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.
Ратуша:
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выходкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.
Слуцкая Брама:
■ Часовая экспазіцыя **"Святло"** (падсвечнікі, кандэлябры, шандалы) — да 30 верасня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…"**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
■ Квэст **"Белы слон"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.

■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"**.
■ Выставачны праект гісторыка Ігара Мельнікава **"Мяжа была пад Мінскам. 1921 — 1941"** — з 17 верасня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска
ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
■ Адноўленая экспазіцыя **"Адкрыццё жывапісу"**

(візуальная рэтраспектыва творчасці народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва).
■ Выставачны праект з цыкла **"Асабістыя гісторыі"** **"Мінская прапіска. Частка 1. Happy New Minsk"**.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганаровому грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выставы фотаздымкаў ізраільскага кінааператара, фотажурналіста і дакументаліста Барыса Бяленкіна **"Тэль-Авіў у Мінску"** і **"Дыялог эпох"** — з 19 да 29 верасня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Выставачныя праекты:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.
■ **"Археалагічныя артэфакты ў XII — XIX стст."**
■ Выстава **"Вобразы Мінска"** ў фалерыстыцы, нумізматыцы, баністыцы, фарфоры з прыватных збораў мінскіх калекцыянераў — з 14 верасня да 3 лістапада.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	**ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	**Праспект Пераможцаў, 5.**
	Вуліца Рабкораўская, 17.
Праспект Незалежнасці, 44.	**Праспект Незалежнасці, 68, В.**
Вуліца Валадарскага, 16.	**Вуліца Лабанка, 2.**

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8-2.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Беларускі брыльянт у кароне паладыумных абразоў праваслаўя"** — да 27 кастрычніка.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава фотаздымкаў удзельнікаў фотаклубаў "Мінск" і Hannover Route 12/13 **"Мінск — Гановер"** — да 15 верасня.

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г. Навагрудак, вул. Гродзенская, 2.
Тэл. (8-01597) 2 14 70.
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.
г. Навагрудак, вул. Мінская, 64-66.
■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў"**, **"Малюнкі сельскага жыцця"**, **"Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Персанальная выстава мастака Васіля Касцючэнкі **"19+"** — да 16 верасня.
■ Выставачны праект **"Акварэльны фестываль"** — да 16 верасня.
■ Выстава **"Паштовыя маркі КНДР"** — з 17 да 30 верасня.
■ Выстава жывапісу Паўла Кандрусевіча **"Memoria. Памяць"** — з 17 да 30 верасня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Мастацкая выстава секцыі БСМ **"Верасень"** — да 15 верасня.
■ **III Беларускае Трыенале графічнага дызайну** — да 15 верасня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
Адкрыццё тэатральнага сезона
■ **15, 16 — "Князь Ігар"** (опера ў 2-х дзеях з пралогам і эпілогам) А.Барадзіна. Дырыжор — Аляксандр Анісімаў. Прэм'ера. 15 верасня пачатак а 18-й.
■ **17, 18 — "Анастасія"** (харэаграфічная легенда ў 2-х дзеях) В.Кузняцова. Дырыжор — Андрэй Галанаў.
■ **18 — Канцэрт "Шэдэўры сусветнай оперы"**. Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **19 — "Багема"** (опера ў 4-х дзеях) Дж.Пучыні. Дырыжор — Алег Лясун.
■ **20 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага. Дырыжор — Вячаслаў Чарнуха-Воліч.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 154 04 44.
■ **14 — "Мудрамер"** (сатырычная камедыя) М.Матукоўскага. Прэм'ера.
■ **15 — "Прафесія любові"** (юбілейны творчы вечар Аляксандра Гарцуева).
■ **16 — "Кар'ера доктара Рауса"** (гістарычна недакладная трагікамедыя) В.Марціновіча.
■ **17 — "Гендарныя выкрунтасы"** (фантастычная камедыя вар'яцкіх становішчаў) А.Курэйчыка. Прэм'ера.
■ **18 — "Любоў людзей"** (трылер) Д.Багаслаўскага.
■ **19 — "Тры Жыззлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **20 — "Білет на брэсцкі цягнік"** (тролінг у адной дзеі) В. Каралёва. Прэм'ера.
■ **21 — "Паляванне на сябе"** (не камедыя) А.Вампілава.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **15 — "Брэменскія музыкі"** В.Ліванава, Ю.Энціна. Пачатак аб 11-й.
■ **15 — "Лялькі Ціма Талера або Прададзены смех"**. (містычная гісторыя ў 2-х дзеях). Пачатак а 17-й.
■ **21 — "Касмічная казка"** Х.Паўкша. Пачатак аб 11-й.